Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Горкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 37 (3941)
НЯДЗЕЛЯ, 8 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬНІШЧЫЦЬ ПЕРАШКОДЫ

НА ШЛЯХУ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПАСТАНОЎ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ КАНТРАКТАЦЫІ

Новая хваля калгаснага прыліву, баявая падрыхтоўка да сяўбы—лепшы адказ на адозвы СНК і ЦК

Рабочае забесьпячэньне—на вышэйшую ступень

Посьпехі, дасягнутыя рабочай клясай і працоўнымі масамі Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам партыі, у сацыялістычным будаўніцтве за першыя два гады пяцігодкі, даюць нам магчымасьць на трэці год узяць яшчэ больш высокія тэмпы разьвіцьця. 1931 год — рашаючы ў выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Тэмпы рашаючага году патрабуюць карэнным чынам палепшыць справу рабочага забесьпячэньня, што зьявіцца важнейшай умовай далейшага павялічэньня рэальнай зарплаты рабочым.

Шпаркае разьвіцьцё індустрыялізацыі краіны і на гэтай базе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі далі нам магчымасьць у асноўным вырашыць збожжавую праграму і ўзяцца за пасьпяховае вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі. Усё гэта дае поўную магчымасьць значна палепшыць у бягучым годзе рабочае забесьпячэньне, асабліва на асноўных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Устаноўлены зараз парадак рабочага снабжэньня забясьпечвае першачарговае гарантаванае павялічанае снабжэньне прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі асноўных рабочых надраў, занятых на важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Па СССР на гарантаванае забесьпячэньне бярэцца 32 млн. рабочых супрэць 26 млн. у мінулым годзе.

Па гарадох БССР узяты на гарантаванае забесьпячэньне 654,8 тыс. працоўных з якіх 72,6 тыс. працоўных — па першай катэгорыі, 210,4 тыс. — па другой катэгорыі і астатнія 371,8 тыс.—па трэцяй катэгорыі. Нормы забесьпячэньня працоўных значна павялічаны супроць мінулага году па ўсіх прадуктах для першай і другой катэгорыі, як саміх рабочых, так і іх утрыманцаў.

Зразумела, што і тут мы сустрэнемся з правымі і «лявацкімі» настроямі супроць першачарговага забесьпячэньня асноўных рабочых кадраў, за беспрынцыповую ўраўнілаўку.

Трэба даць рашучы адпор такім настроям. Партыя, змагаючыся ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ ДАБРАБЫТУ ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ, зусім правільна ставіць задачу больш поўна забясьпечыць асноўныя рабочыя масы, супроць беспрынцыповых ураўнілаўскіх тэндэнцый трэба змагацца самым рашучым чынам.

Правядзеньне ў жыцьцё агульнага паляпшэньня рабочага забесьпячэньня і больш поўнае забесьпячэньне асноўных рабочых кадраў зьвязана і з тым, наколькі мы выканаем нашы загатоўчыя пляны, наколькі мы забясьпечым далейшую канцэнтрацыю ўсіх таварных пішкаў нашай сельскай гаспадаркі ў руках каапэрацыі для больш поўнага забесьпячэньня імі рабочых, гэтым самым павялічыўшы ахоп рабочага бюджэту праз каапэрацыю па танных дзяржаўных цэнах.

Па многіх галінах загатовак пляны дагэтуль яшчэ ня выкананы, што зьяўляецца вынікам апартуністычнай недаацэнкі гаспадарча-палітычнага значэньня гэтых кампаній з боку паасобных раённых загатоўчых арганізацый.

Па збожжазагатоўках пляны яшчэ ня выкананы. На 1-га лютага мы маем усяго каля 90 проц. пляну; па бульбе—да 60 проц., па мясе — 26 проц. Асабліва ганебна ідзе выкананьне пляну па малочных прадуктах. План асобнага кварталу выкананы усяго на 14 проц. Большасьць загатоўчых органаў як цэнтральных, так і раёных, спадзяваліся на самацёк, не зразумелі, што зараз, па ўмовах абвостранага клясавага змаганьня ўсякая масавая загатоўчая кампанія патрабуе сыстэматычнай масавай работы сярод калгасьнікаў, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас.

Рад загатоўчых арганізацый не забясьпечыў належнага адпору кулацтву ў яго контр-рэвалюцыйнай рабоце па зрыве загатовак. Асабліва выразна гэта выяўляецца ў загатоўках мяса і малочных прадуктаў. Кулак аказвае шалёнае супраціўленьне ў здачы жывёлы па цьвёрдых заданьнях, агітуе за здачу нядобраякасной жывёлы ў выглядзе цельных кароў, котных авечак, дробных парасят, якія ня могуць быць з посьпехам выкарыстаны ні для камплектаваньня, ні для мясазабесьпячэньня. Па малочных прадуктах да гэтага часу кулаку амаль зусім ня даны цьвёрдыя заданьні. Падрыўная работа кулацтва часта на мясцох не сустрэне руйнуючага адпору.

Усім гэтым агідным зьявішчам у справе загатовак прадуктаў харчаваньня павінна быць абвешчана суровая барацьба. Партыя і ўрад не пацерпяць тых, якія сваёй бязьдзейнасьцю зрываюць справу рабочага забесьпячэньня.

Арганізуючы масы на поўнае выкананьне загатоўчых плянаў, даючы рашучы адпор скрыўленьням клясавай лініі ў рабоце загатоўчых арганізацый, узмацняючы наступленьне і змаганьне з кулаком, яго агентамі-апартуністамі, з антыпралетарскімі беспрынцыповымі тэндэнцыямі ўраўнілаўкі — мы выканаем задачы, што стаяць перад намі ў галіне рэалізацыі гаспадарчых заданьняў, узьнімем на вышэйшую ступень справу рабочага забесьпячэньня на аснове ажыцьцяўленьня прынцыпаў клясавага разьмеркаваньня прадуктаў і тавараў, паставім справу снабжэньня на службу забесьпячэньня асноўных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, паскорым тэмпы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны.

Гаспадарчы развал у фашысцкай Польшчы паглыбляецца

Аб тым эканамічным разале, у які ўсё глыбей і глыбей пагружаецца фашысцкая Польшча, ярка сьведчыць бязупыннае зьмяншэньне паступленьняў дзяржаўных даходаў. Як вядома, галоўнай крыніцай дзяржаўных даходаў зьяўляюцца падаткі. І вось не дапамагаюць ужо экзэкутары і аукцыёны, не дапамагаюць карныя экспэдыцыі за нявыплату падатку, не дапамагаюць і павялічаныя у некалькі раз штаты падатковых зборшчыкаў, — паступленьні дзяржаўных даходаў усё зьмяншаюцца і зьмяншаюцца. Урадавыя «Статыстычныя Ведамасьці» ў адным са сваіх апошніх нумароў падаюць цікавую таблічку паступленьняў дзяржаўных даходаў за 1930 год.

«У красавіку 1930 году—пішуць «Статыстычныя Ведамасьці»,—паступіла даходу 234,8 млн. злотых (за гэты-ж месяц у мінулым 1929 годзе паступіла 250,9 млн. злотых)—зьмяншэньне на 16,1 млн. злотых, у маі 1930 году—232,4 млн. злотых (у маі 1929 году—245,3 млн. злотых)—зьмяншэньне на 12,9 млн. злотых, у чэрвені 1930 году 216,2 млн. злотых (232,6 млн. злотых)—зьмяншэньне на 16,4 млн. злотых, ліпень—241,7 млн. злотых (251,8 млн. злотых)—зьмяншэньне на 9,9 млн. злотых, у жніўні—215,2 млн. зл. (233,1 млн. зл.)—зьмяншэньне на 17,9 млн. зл., верасень—222,6 млн. зл. (238,8 млн. зл.)—зьмяншэньне на 16,2 млн. зл., кастрычнік—234,4 млн. зл. (270,8 млн. зл.)—зьмяншэньне на 36,4 млн. зл., лістапад—223,0 млн. зл. (237,6 млн. зл.)—зьмяншэньне 50,6 млн.зл., сьнежань—245,4 млн. зл. (265,0 млн. зл.)—зьмяншэньне на 19,6 млн. зл. Усяго-ж дзяржаўныя даходы ў 1930 годзе склалі 2.065,9 млн. зл. супроць 2.261,8 млн. зл. ў 1929 годзе, або зьмяншэньне на 195,9 млн. зл. супроць 1929 году.

За цэлы год. як піша «Газэта Варшавска», зьмяншэньне дзяржаўных даходаў вызначаецца ў суме каля 260 млн. злотых.

Сярэдні месячны дзяржаўны даход складае такім чынам 229,5 млн. злотых. У бюджэце-ж на 1931-32 гаспадарчы год, складзеным п. Матушэўскім, сярэдні месячны даход прадбачыцца ў 238 млн. злотых, гэта значыць, павялічаны у месяц амаль на 10 млн. зл., у той час, калі нават фашысцкая прэса ня мае падзеі ў хуткім будучым на гаспадарчае паляпшэньне краю.

Лічбовыя даныя, асабліва за апошнія тры месяцы—кастрычнік, лістапад і сьнежань, зьяўляецца асабліва паказальнымі для таго крызісу, які зараз перажывае фашысцкая Польшча, бо яны паказваюць зьмяншэньне дзяржаўных даходаў звыш чым на 100 млн. злотых у асеньніх месяцы, гэта значыць у тыя месяцы, калі адбываецца рэалізацыя ўраджаю і, здавалася-б, найбольш спрыяючыя для павялічэньня паступленьняў дзяржаўных прыбыткаў, як гэта мы бачым у мінулым 1929 годзе.

Адкуль-жа фашысцкі ўрад возьме гэтае павялічэньне дзяржаўных даходаў, калі гаспадарчы крызіс паглыбляецца, калі няма нават надзеі хаця-б на мінімальнае паляпшэньні гаспадарчай сітуацыі ў недалёкім будучым?

На гэта дае адказ таяж самая польская буржуазная прэса.

Так «Газэта Варшавска» ад 28 студзеня піша, што калі перад вайною на душу ў Польшчы прыпадала 48 злотых падаткаў, то ў 1924-25 годзе—71 злотых, у 1926-27 г.—54 злотых, у 1927-28 годзе —85 злотых, у 1928-29 годзе—93 злотых, а ў 1929-30 годзе—130 злотых. Трэба адмак, зазначыць,—піша далей газэта, —што сюды не ўваходзяць падаткі гмінныя, сэймікавыя і інш., якія складаюць ня меншую суму, чым дзяржаўныя падаткі. Дык вось на кім хоча выехаць палкоўніцкі ўрад фашысцкай Польшчы, урад падрыхтоўкі ўзброенай інтэрвенцыі супроць Савецкага Саюзу, —ён думае ўвесь цяжар мільярдных узбраеньняў усклаасьці на плечы працоўных мас, потам, крывёй і галоднай сьмерцю тысяч беспрацоўных ён думае ратаваць фашысцкую дыктатуру, якая хістаецца. Ці ўдасца гэта фашысцкаму ўраду,—пакажа будучыня.

Грабеж беспрацоўных—

вось рэцэпт пана Р. Дмоўскага для выхаду з крызісу

ВАРШАВА, 3. Правадыр польскіх нацыянал-дэмакратаў Раман Дмоўскі апублікаваў новую сэрыю сацыяльна-палітычных артыкулаў пад агульнай назвай «Крызіс». У сваіх артыкулах Дмоўскі разьвівае мысьль, што разруха, якая перажываецца капіталізмам, зьяўляецца не парыдычным зьявішчам, а глыбскім пераваротам у гаспадарчых адносінах. Ня вернецца ўжо тое, што было да гэтага часу,—заяўляе Дмоўскі,—крызіс будзе працягвацца, пакуль ня будзе ліквідавана ўсё тое, што засуджана на пагібель».

Характэрна, што Дмоўскі ўпяршыню ў польскім буржуазным друку выступіў з рэзкай крытыкай італьянскага фашызму. Дмоўскі піша: «Гаспадарчая катастрофа, якая перажываецца, падрывае фашысцкі рэжым так моцна, як гэтага не магла зрабіць ніякая барацьба, ніякія намаганьні. Яна пазбаўляе яго матар'яльнай базы. Ня менш пэсымістычна ацэньвае Дмоўскі будучыню ПАЗШ, Англіі і Нямеччыны і пры гэтым зьезд куецца над фардымам, як сродкам перамогі крызісу і г. д.

Малюючы распачлівыя пэрспэктывы сусьветнага і польскага капіталізму, Дмоўскі не знаходзіць нічога лепшага для паняпраджаньня катастрофы, як «узмацненьне ўсеагульнай галечы». Дмоўскі патрабуе скасаваньня ці значнага скарачэньня сацыяльнага заканадаўства, бо, «што а таго, што адны будуць застрахаваны, калі другія будуць паміраць з голаду?». Дмоўскі бачыць толькі два шляхі: «ці сьмерць аднэй часткі працоўных ад голаду і паляпшэньне за гэты кошт становішча рэшты, ці ўсім загінуць павольнай сьмерцю ад галечы, бядомнасьці і някультурнасьці». Адзінага рэальнага выхаду з крызісу — пралетарскай рэвалюцыі— Дмоўскі, зразумела, ня бачыць. (ТАСС).

СЬМЕРЦЬ ЮГА-СЛАЎСКАГА СТУДЭНТА АД ПАБОЯЎ ПАЛІЦЫІ

ВАРШАВА, 6. У турэмнай больніцы ў Новым Таргу памёр студэнт мэдычнага факультэту юга-слаўскі грамадзянін ІВО КАРНЭЛЬ, які прабываў у больніцы тры гады пасьля ЗЬБІЕНЬНЯ ЯГО ПАЛІЦЭЙСКІМ У КРАКАВЕ. У рэзультаце пабояў Корнэль доўга хварэў і звар'яцеў, занядужыўшы ў вострай форме на маню прасьледаваньня.

Сьмерць Карнэля зрабіла вялікае ўраманьне ў сувязі з агульным становішчам унутры Польшчы, якое ўчора было ахарактарызавана ў сэнаце адным з прамоўцаў наступным чынам: «За АПОШНІ ЧАС ТОЛЬКІ І ЧУЕШ АБ ПОЛЬШЧЫ, ШТО ЗБІВАЮЦЬ І Б'ЮЦЬ —Б'ЮЦЬ НА ЗАХАДЗЕ, Б'ЮЦЬ НА ЎСХОДЗЕ, ЎСЮДЫ Б'ЮЦЬ».

Катаржны прысуд над рэвалюцыйнымі сялянамі ў Наваградку

Гэтымі днямі ў Наваградзкім акруговым судзе слухалася справа чатырох рэвалюцыйных сялян—Я. Пронька, К. Дударэвіча, В. Карповіча і Ю. Пячура па абвінавачаньні ў прыналежнасьці нібы да «камуністычнае» змовы з мэтай адарваньня ад Польшчы часткі тэрыторыі і далучэньня яе да Савецкай Беларусі (4 чал.—вось дык змова!—рэд.).

Як правіла, галоўнымі сьведкамі з боку абвінавачаньня і на гэтым працэсе былі паліцэйскія і агенты дэфэнзывы.

Фашысцкі суд пасьля некалькі гадзінай нарады вынес прысуд, на падставе якога падсудны Пронька засуджан на 6 год катаргі, Дударэвіч і Пячура—на 4 гады катаргі кожны і Карповіч на 1 год катаргі.

12-га лютага у 6 гадзін вечара у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б (вул. Энгельса, 28) склікаецца

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

з парадкам дня:

1) Аб падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы і далейшых задачах у галіне калектывізацыі па прыгарадных раёне з дакладам аб падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы па прыгарадных гаспадарках МЦРК.

(дакл. т. т. АКСЮЧЫЦ і КУМКЕС).

2) Аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону 1931 году.

(дакл. тав. ГОЛЬДБЭРГ).

3) Вынікі партасьветы за І-е паўгодзьдзе.

(дакл. тав. ПЯТУШКОЎ).

Апрача членаў і кандыдатаў гаркому КПБ, рэвізкамісіі гаркому КП(б)Б, на пленум выклікаюцца:

па першым пытаньні сакратары вясковых парт'ячэек, старшыні сельсаветаў, калгасаў і кіраўнікі саўгасаў (камуністы);

па другім пытаньні—сакратары парткалектываў і кіраўнікі будаўнічых арганізацый (камуністы);

па трэцім пытаньні—прапагандысты партшкол.

Гарком КП(б)Б.

Арышт зьезду ППС—Лявіцы

350 дэлегатаў зьезду пасаджаны за турэмныя краты

ВАРШАВА, 3. 1-га лютага ў Лодзі адкрыўся краявы зьезд левай ППС. Падрыхтоўка да зьезду, як і сам зьезд, адбываліся ЦАЛКАМ ЛЕГАЛЬНА. На зьезд, апрача дэлегатаў з усёй Польшчы, прыбыла вялікая колькасьць гасьцей.

2-га лютага ў залю пасяджэньняў зьезду прыбыла паліцыя, якая АРЫШТАВАЛА ЎСІХ 350 ЧАЛАВЕК, ШТО ЗНАХОДЗІЛІСЯ Ў ЗАЛІ. Затрыманыя адведзены ў палітычную паліцыю.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Згержы

ВАРШАВА, 6. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Згержы, працягваецца ўжо трэці месяц. Бастуе каля 7 тыс. чалавек. Зусім спыніліся ўсе 7 буйных фабрык у Згержы. Кіраўніцтва забастоўкай у руках прафсаюзнай лявіцы. Адбыўся рад мітынгаў. Забастоўка выбухнула ў адказ на спробу прамыслоўцаў скараціць варплату на 20 проц.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ У КРАКАВЕ

«Газэта Польска» ад 31 студзеня піша, што апошнімі днямі ў Кракаве і Хжанове нібы ліквідавана камуністычная арганізацыя. У зьвязку з гэтым як у Кракаве, так і ў Хжанове праведзены масавыя вобыскі. У выніку ў Кракаве 24 асобы арыштаваны, у тым ліку 13 жанчын на падазрэньні ў камуністычнай дзейнасьці.

Паводле паведамленьня паліцыі, у часе вобыску захоплена шмат літаратуры, прысьвечанай сёмай гадавіне сьмерці Леніна, Лібкнэхта і Р. Люксэмбург.

У Хжанове-ж, паводле паведамленьня паліцыі, арыштаваны дзьве асобы нібы ў той момант, калі яны вывешвалі анты-ўрадавыя лёзунгі.

Катаржны прысуд над рэвалюцыйнай моладзьдзю ва Львове

Гэтымі днямі ва Львоўскім акруговым судзе адбыўся вялікі палітычны працэс супроць рэвалюцыйнай моладзі па абвінавачаньні ў прыналежнасьці нібы да камсамолу. На лаве падсудных—18 асоб. Працэс працягваўся амаль тыдзень.

Прытаварам суда засуджаны: Шульсінгер, Шульсінгерава і Белянеўскі на тры гады катаргі кожны з абвастрэньнем; Мунда і Габэр — на 2 гады катаргі кожны з абвастрэньнем; Рыкава — на паўтары гады катаргі з абвастрэньнем; Валошын, Пасота і Гермада — на год катаргі кожны з абвастрэньнем.

Адозвы—у масы

ПЕРШЫМІ Ў БССР ПРАКТЫЧНА АДГУКНУЛІСЯ НА АДОЗВУ аб кантрактацыі КАЛГАС «ТРАКТАР» І КАЛГАСЬНІКІ, А ТАКСАМА АДНААСОБНІКІ—БЕДНЯКІ І ТЕРАДНЯКІ м. ЛЕНІНА Ў СЛУЦКІМ РАЁНЕ.

ЧЛЕНЫ КАЛГАСУ «ТРАКТАР», абмеркаваўшы адозву і свой пасеўны план, ПАСТАНАВІЛІ ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ УСЕ СВАЕ ЯРАВЫЯ ЗАСЕВЫ, значна пашырыўшы плошчу пад тэхнічныя і кармавыя культуры.

«Адначасова, — гаворыцца ў пастанове, — мы зварачаемся да ўсіх беднякоў і сераднякоў нашага раёну—абмяркуйце адозву і вялізарныя мерапрыемствы, вызначаныя партыяй і ўрадам—завоз трактараў, машын, пазьні, якія накіроўваюцца на вызваленьне нас, беднякоў і сераднякоў, ад галечы і цемры, ад купацкай кабалы, на ўмацаваньне нашай пралетарскай краіны. Нашым першым водгукам на адозву партыі і ўраду —павінна быць уступленьне ў калгасы».

Тут-жа на сходзе ТРАКТАРАЎЦЫ АРГАНІЗАВАЛІ З СВАІХ ЛЕПШЫХ АКТЫВІСТАЎ ВЯРБОВАЧНЫЯ КАМІСІІ.

КАЛГАСЬНІКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ м. ЛЕНІНА, абмеркаваўшы пастанову аб кантрактацыі, абавязаліся поўнасьцю выканаць план веснавой сяўбы, А ТАКСАМА ПАСТАНАВІЛІ ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ УСЕ СВАЕ ЯРАВЫЯ НА ПЛОШЧЫ 833 ГЭКТ.

Ня ў прыклад калгасьнікам і аднаасобнікам перапічаных двух пунктаў Слуцкага раёну, БОЛЬШАСЬЦЬ РАЁНАЎ ЯШЧЭ ЗУСІМ НЕ РЭАГУЕ НА ГІСТАРЫЧНУЮ АДОЗВУ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ КАНТРАКТАЦЫІ, што зьяўлецца вынікам недаацэнкі яго вялізарнага палітычнага значэньня з боку нізавых і нават раёных арганізацый.

І ПАСЬЛЯ АПУБЛІКАВАНЬНЯ АДОЗВЫ ЦК КП(б)Б І ЎРАДУ БЕЛАРУСІ, СТАНОВІШЧА НЕ ЗЬМЯНІЛАСЯ. ЗАРАЗ МЕСЦЫ ЎЖО ЧАКАЮЦЬ ПРЫСЫЛКІ... ІНСТРУКЦЫІ І ПЛЯНАЎ АДПАВЕДНЫХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, на лічачы магчымым пачаць прапрацоўку адозваў па кантрактацыі без спэцыяльных указаньняў і дакладных разьлікаў свайго вышэйшага цэнтру.

Яркі малюнак апартуністычнай дзейнасьці даюць наступныя факты. Наша брыгада з КАПЫЛЬСКАГА раёну паведамляе, што папулярызацыя і ПРАПРАЦОЎКА АДОЗВЫ УСЁ ЯШЧЭ НЕ РАСПАЧАТА, СЯЛЯНЕ САМІ ЗВАРАЧАЮЦЦА Ў РАЙКААПСАЮЗ З ЗАПЫТАНЬНЯМІ АБ КАНТРАКТАЦЫІ, АЛЕ АДКАЗУ НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ. Свой агідны бюракратызм райкаапсаюз імкнецца апраўдаць тым, што ён яшчэ не атрымаў... спэцыяльных інструкцый. Апартуністычная недаацэнка значэньня кантрактацыі характарызуецца і тым, што НАВАТ НА ПЛЕНУМЕ РАЙКОМУ НЯ БЫЛО ПАСТАЎЛЕНА ПЫТАНЬНЕ АБ КАНТРАКТАЦЫІ.

Недаацэнка вялізарнага палітычнага значэньня гістарычнага дакументу наглядаецца і ў арганізацыях Асьвейскага раёну. РАЙКОМ ПАРТЫІ НЕ ПАСТАВІЎ У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ЎСЁЙ РАБОТЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ І РЭАЛІЗАЦЫЮ АДОЗВЫ. Нічога дзіўнага няма, калі прыняць пад увагу наступную заўвагу заг. аргаддзелу райкому ГАЛАЎНЁВА, які заявіў: «МЫ ЛЮДЗІ ПРАКТЫКІ І НЯМА ЧАГО НАМ ЗАЙМАЦЦА АКАДЭМІЧНЫМІ ПЫТАНЬНЯМІ». ДЛЯ ГАЛАЎНЁВА ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМАНТ АБ КАНТРАКТАЦЫІ—ТОЛЬКІ АКАДЭМІЧНАЕ ПЫТАНЬНЕ. ТАКІ АДКРЫТА ВЫКАЗАНЫ АПАРТУНІСТЫЧНЫ ПОГЛЯД КІРУЮЧАГА РАБОТНІКА РАЙКОМУ НЕ АТРЫМАЎ НАЛЕЖНАГА АДПОРУ З БОКУ АКТЫВУ.

БАЛЬШАВІЦКІ АДКАЗ апартуністам тыпу Галаўнёвых даў АСЬВЕЙСКІ РАЁННЫ ЗЬЕЗД, на якім адозва была прапрацавана і пасьля чаго 15 ДЭЛЕГАТАЎ ТУТ-ЖА ЗАПІСАЛІСЯ Ў КАЛГАСЫ.

Канкрэтна ўсё ЯШЧЭ НЕДАПУШЧАЛЬНА МАЛА ЗРАБІЛІ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАПРАЦОЎКІ АДОЗВАЎ І БЕЛАРУСКІЯ ЦЭНТРАЛЬНЫЯ С.-Г. І КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ. БЕЛІЛЬНАСАЮЗ І САДСАЮЗ, НА ЯКІЯ УСКЛАДЗЕНА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫІ, НАВАТ НЯ ВЫСЛАЛІ РАЁНАМ ТЫПОВЫХ ДАГАВАРОЎ, ПЛЯНАЎ У РАЁННЫМ РАЗРЭЗЕ І УСІХ ПАТРЭБНЫХ МАТАР'ЯЛАЎ.

ГЭТА, ЗРАЗУМЕЛА, НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЯ МОЖА СЛУЖЫЦЬ АПРАЎДАНЬНЕМ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У СПРАВЕ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ І ПРАПРАЦОЎКІ АДОЗВАЎ АБ КАНТРАКТАЦЫІ (яркім пацьвярджэньнем гэтага зьяўляюцца факты з Слуцкага раёну), АЛЕ БЯСПРЭЧНА ЗАТРЫМЛІВАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ РАБОТЫ ПА ПАДПІСВАНЬНІ ДАГАВАРОЎ НА МЯСЦОХ, ПА РЭАЛІЗАЦЫІ КАНТРАКТАЦЫІ.

Мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны, нарэшце, па-бальшавіцку ўзяцца за папулярызацыю і ажыцьцяўленьне пастановы аб кантрактацыі. Неабходна рашуча ўдарыць па апартуністах, якія тармозяць рэалізацыю важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

Для асьвейскіх апартуністаў кантрактацыя—толькі акадэмічнае пытаньне

АСЬВЕЯ. (Па тэлеграфу). Партарганізацыя Асьвейшчыны яшчэ не мабілізавана на баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. У райкоме няма нават канкрэтнага пляну работы ў лютым. Розныя палітычна-гаспадарчыя кампаніі не скарыстаны для арганізацыі новага прыліву і з пытаньнямі калектывізацыі ня ўвязаны. Папулярызацыя адозвы аб кантрактацыі не распачата. Сярод партарганізацыі існуе недаацэнка вялізарнага палітычнага значэньня гэтага гістарычнага дакументу. Райком партыі свалячасова не паставіў у цэнтры ўвагі ўсёй работы партарганізацыі папулярызацыю і ажыцьцяўленьне адозвы. Характэрная рыса: заг. аргаддзелу райкому—Галаўнёў заявіў: «мы людзі практыкі і няма чаго нам займацца акадэмічнымі пытаньнямі». Для Галаўнёва гістарычны дакумант аб кантрактацыі—толькі акадэмічнае пытаньне. Такі апартуністычны погляд кіруючага работніка райкому не атрымаў належнага адпору з боку актыву.

Лепшым адказам мясцовым апартуністам тыпу Галаўнёвых зьявілася водгук раённага зьезду саватаў на пастанову ўраду і партыі аб кантрактацыі. Пасьля прапрацоўкі адозвы на зьезьдзе 15 дэлегатаў тут-жа запісаліся ў члены калгасаў.

Толькі зараз адбылася інструкцыйная нарада, пасьля якой 30 чалавек атрымалі пастаноўлена паслаць у сельсаветы. Гэтым райком партыі пачынае мабілізацыю партарганізацый на падрыхтоўку да сяўбы.

Брыгада «Зьвязды»—
Воінаў, Фрадзін.

У Барысаве

УСЁ ЯШЧЭ ЧАКАЮЦЬ...

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад нашага кар.). Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі дагэтуль не папулярызавана сярод бядняцка-сераднякіх мас раёну і сярод калгасьнікаў.

Райвыканком чакае пакуль з Менску ня прыбудуць заданьні. Такое становішча ў райкаапсаюзе і райкалгасаюзе, якія дагэтуль не далі ніякіх паказаньняў калгасам. Ні ў адным калгасе ні ў адной вёсцы не абмяркоўвалі гэтай важнейшай пастановы.

Адозва не абмеркавана нават пленумам райкому

КАПЫЛЬ. (Па тэлеграфу). Папулярызацыя і распрацоўка адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі ў раёне яшчэ не распачата. РАЙКААПСАЮЗ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗАПЫТАНЬНІ СЯЛЯН АБ УМОВАХ КАНТРАКТАЦЫІ, АДКАЗУ НЕ ДАЕ, спасылаючыся на тое, што ён нібы гэтых умоў ня ведае. Раённыя арганізацыі ўсё чакаюць спэцыяльных інструкцый цэнтру аб кантрактацыі. На пленуме райкому партыі пытаньне аб кантрактацыі нават ня было пастаўлена.

Брыгада «Зьвязды»—Клюйкэ, Фрыд, Цімафеенка.

Абмен калгаснай практыкай паміж Заходняй вобласьцю і БССР

Учора ў Менск прыехала брыгада калгасьнікаў Зах. вобласьці для абмену вопытам у працы.

У склад брыгады ўваходзяць чатыры прэміраваныя ўдарнікі лепшых калгасаў: тав. Лібэрман з яўрейскага калгасу «Чырвоная Ворка», тав. Брафогель з латыскага калгасу «Чырвоны стралок», тав. Занкевіч з польскага калгасу імя Першай пяцігодкі і тав. Міхонін з камуны імя Калініна.

Учора нам. старшыні Волкалгасцэнтру тав. Строеле правёў з брыгадзірамі гутарку, у якой абрысаваў становішча клгасаў БССР і задачы, якія стаяць перад брыгадзірамі.

Учора брыгадзіры выехалі ў Лёзьненскі, Слуцкі, Капыльскі і Койданаўскі раёны.

12 новых калгасаў—у падарунак зьезду саветаў

НАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.). Калгасьнікі, беднякі і сераднякі Насьцюковіцкага раёну арганізуюць у гонар зьезду саветаў чырвоныя абозы са збожжам, бульбай, ільном, жывёлай. За 2 дні здана дзяржаве 10.000 кгр. збожжа, 112 тыс. кгр. бульбы, 4.300 кгр. ільнасемя, 10.080 кгр. ільнавалакна і інш. У раёне арганізавалася 12 новых калгасаў, якія аб'ядналі 266 гаспадарак. У існуючыя калгасы ўступіла яшчэ 187 гаспадарак.

Рабочыя саўгасаў раёну рапартавалі зьезду аб сваіх посьпехах.

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР. Уся работа зьезду праходзіць пад знакам шырокай крытыкі і самакрытыкі.

Чырвонымі абозамі—

сустрэлі зьезд саветаў

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Адкрыўся 6-ты зьезд саветаў Рагачоўскага раёну. Калгасьнікі, беднякі і сераднякі-аднаасобнікі арганізуюць чырвоныя абозы ў падарунак зьезду. У першы дзень работы зьезду чырвонымі абозамі здана 46.400 кгр. збожжа, 11 680 кгр. сена і саломы, 960 кгр. ільну, 76 галоў буйное рагатае жывёлы і інш. Чырвонымі абозамі вывезена таксама на станцыі чыгункі 2.500 кубаметраў лесаматар'ялаў і дроў.

Зьезд праходзіць з вялікім уздымам і энтузіязмам. У часе падрыхтоўкі да зьезду па раёне арганізавана 14 новых калгасаў з 220 гаспадарак. У старыя калгасы ўлілося яшчэ 60 гаспадарак.

Пралетары ўсяго сьвету рыхтуюцца да 25-га лютага

У рэвалюцыйны фронт уключаецца працоўнае сялянства. Масы мабілізуюцца на барацьбу

У краіне „прасьпэрыты"—беспрацоўныя гінуць тысячамі ад голаду

ВАШЫНГТОН, 5. Пад усё ўзрастаючым уціскам мас, у прыватнасьці, пад уражаньнем нядаўніх галодных дэманстрацый, дэмакраты і прагрэсіўныя рэспубліканцы патрабавалі нязначных асыгнаваньняў па аказаньне дапамогі насельніцтву. Дэмакратычны сэнатар—Караўэй рэзка нападаў на Гувэра, заявіўшы, што Гувэр пярэчыць супроць аказаньня дапамогі ў той час, калі штодзённа ад голаду памірае тысяча чалавек. Адказваючы, Гувэр адстойваў сваю пазыцыю, заяўляючы, што дапамога з боку дзяржавы «зьнішчыць упаўненасьць насельніцтва ва ўласных сілах» і «аслабіць сілу амэрыканскага характару».

Падрыхтоўка да міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем у Вене

ВЕНА, 30. Аўстрыйская кампартыя разгортвае работу па падрыхтоўцы міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем — 25 лютага.

У Вене і правінцыі адбываюцца мітынгі і сходы рабочых і беспрацоўных. Адбыліся тры сходы, у якіх прымалі ўдзел беспрацоўныя. Мэтаністы, будаўнікі і абутнікі.

Заклік да мабілізацыі шырокіх мас працоўнага сялянства

БЭРЛІН, 1. Бюро эўрапэйскага сялянскага камітэту настанавіла прыняць удзел у правядзеньні міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя (25 лютага) і прапанавала камітэтам рэвалюцыйных сялян ва ўсіх краінах разгарнуць работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўнага сялянства.

Галеча дасягнула жудасных разьмераў

НЬЮ-ЁРК, 5. Апісваючы надзвычай цяжкае становішча насельніцтва ў штаце Кентукі, карэспандэнт «Нью Ёрк Ўінінг Пост» піша: «Галеча дасягнула такіх разьмераў, што многія сем'і за бясконак прадаюць свае ложкі і печы. Працуючыя па аказаньні дапамогі знаходзілі людзей, якія спалі на падлозе ўпавал. Некаторыя сем'і жывуць як дзікія зьвяры сярод скал. У адной аддаленай хібарцы было знойдзена жывое дзіця ля трупаў сваіх бацькоў».

75 проц. усіх рабочых Чэха-Славакіі—без работы

ПРАГА, 31. Тэкстыльная прамысловасьць Чэха-Славакіі апынулася ў стане поўнага развалу. Паводле апошніх даных, спынілі работу з прычыны крызісу каля 300 тэкстыльных прадпрыемстваў. У бліжэйшы час закрываецца яшчэ рад фабрык. Больш 210 тыс. тэкстыльных рабочых (звыш 75 проц. усяго складу) без работы, або працуюць няпоўны тыдзень.

ПА СЬЛЯДОХ КРЫВАВЫХ ЦЭРГІБЭЛЯЎ

Расстрэл дэманстрацыі беспрацоўных у Чэха-Славакіі

ПРАГА, 5. 4 лютага ў радзе рабочых цэнтраў Бэгеміі паміж дэманстраваўшымі беспрацоўнымі і жандармэрыяй адбыўся жорсткія сутыкненьні. У Згеры

Вышэй сьцяг бальшавіцкай самакрытыкі

Барысаўскі райком партыі, замест мабілізацыі мас на выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі, на разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, стаў на непартыйны шлях апраўданьня сваіх апартуністычных памылак, працягваючы заціск самакрытыкі

Парткіраўніцтва віцебскай арганізацыі ня выканала дырэктыў ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні самакрытыкі

Пралетарскай барысаўскай арганізацыі— бальшавіцкае кіраўніцтва

«Партыя заклікала працоўных да жорсткай самакрытыкі для таго, каб гэту самакрытыку зрабіць вагаром барацьбы за сапраўднае папраўленьне ўсяго апарату, для сапраўднай,—а не папяровай—барацьбы з бюракратызмам, для мясцовага паходу супроць усіх ворагаў, пачынаючы ад кулака і шкодніка, канчаючы элементамі разлажэньня ў нашых уласных радох»—так гаворыцца ў вядомай адозьве ЦК УсеКП(б) аб самакрытыцы. Высоўваючы і наўмысна праводзячы ў жыцьцё лёзунг аб разгортваньні жорсткай пралетарскай самакрытыкі, партыя на працягу ўсяго перыяду яе вастрыё накіроўвала і накіроўвае супроць правых і «левых» апартуністаў і капітулянтаў усіх колераў, супроць усіх тых, хто імкнецца хоць у найменшай ступені на самым малым вучастку прарваць жалезны фронт пераможнага сацыялістычнага наступленьня на кулака, нэпмана, на ўсе капіталістычныя элементы краіны.

Агнём бальшавіцкай бязьлітаснай крытыкі партыя выкрыла дробна-буржуазную сутнасьць апартуністычных тэорый і платформ, якія выкрэйваліся і клеіліся, як адкрытымі правымі апартуністамі, так і «левакамі» і біспрынцыпнай групоўкай — права - «лявадкім» блёкам з рэшткаў контр-рэвалюцыйнага троцкізму. Выкрыўшы іх варожыя пралетарыяту тэорыі, партыя разграміла правых і «левых» апартуністаў як ідэйна, так і арганізацыйна. З такімі-жа вялікім посьпехам, карыстаючыся магутным сродкам—самакрытыкай, партыя выкрывае права-апартуністычную практыку ў рабоце асобных зьвеньняў як партыі, так і дзяржаўнага апарату, выкрываючы агентаў кулака, бюракратаў і ўсіх тых, хто перашкаджае пасьпяховаму выкананьню пяцігодкі за чатыры гады.

Адна, у асобных зьвеньнях нашай КП(б)Б пазаторны нават кіруючыя работнікі не зразумелі ўсяго таго значэньня, тае магутнасьці, якая ўласьцівa самакрытыцы, як адзнаму з найлепшых мэтадаў барацьбы за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі. У результаце котага неразуменьня, мы маем за апошні час буйныя палітычныя прарывы ў кіраўніцтве раду партыйных арганізацый. Гарадзецкая, Сеньненская, Чэрэйская і, нарэшце, Барысаўская — вось тыя арганізацыі, у кіраўніцтве якіх выкрыты палітычныя прарывы, грубыя скажэньні генэральнай лініі партыі і наяўнасьць правапартуністычнай практыкі ў рабоце. Характэрна, што правапартуністычная практыка знайшла свае большае распаўсюджаньне там, дзе менш за ўсё была разгорнута самакрытыка, дзе на яе разгортваньне менш за ўсё былі мабілізаваны масы. Адсутнасьць жорсткай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі — спрыяючая глеба для дзейнасьці апартуністаў усіх колераў. Гэта вусім бясспрэчнае палажэньне.

Чым абумоўлены барысаўскія прарывы

У Барысаўскай, напрыклад, арганізацыі імена толькі таму, што ня была выстарчальна разгорнута самакрытыка, на радзе вучасткаў работы мелі месца буйныя палітычныя прарывы.

У чым сутнасьць гэтых прарываў?

Па-першае, у тым, што раённае кіраўніцтва партарганізацыі аказалася нездольным мабілізаваць масы на выкананьне праграмы трэцяга году пяцігодкі, што парткіраўніцтва праводзіла яўна-правапартуністычную практыку. Яна выявілася ў нежаданьні мабілізаваць нябывала ўзросшую актыўнасьць рабочых мас на выкананьне прамфінпляну. На радзе буйнейшых прадпрыемстваў, як «Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская перамога» і інш., апартуністы штучна зрэзалі пляновыя заданьні і нежаданьнем кіравацъ сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам развальвалі ўдарныя брыгады, якія стыхійна расьлі на прадпрыемствах. Прамфінплян на «Чырвонай Бярэзіне» ў параўнаньні з ударным кварталам быў зрэзаны на 6 проц., а на «Пралетарскай перамозе»—на 4 проц. Раённае парткіраўніцтва заставалася ў адносінах да гэтых, як і да шматлікіх іншых злачынных фактаў, глухім і нямым.

У пытаньнях кіраўніцтва разгортваньнем сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, умацаваньнем фронту наступленьня на кулацтва да поўнай яго ліквідацыі, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, бюро райкому апынулася ў палоне апартуністычнай стаўкі на самацёк. Раскулачаныя кулакі на 85 проц. аселі ў калгасах і імкнуліся ўзарваць іх з сярэдзіны. Калгасы былі прадастаўлены самі сабе. Работа на іх палітычным і гаспадарчым замацаваньні не праводзілася. І больш таго. Кіраўніцтва на чале з Сасноўсіим імкнулася штучна зьнізіць тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў раёне. Бюро райкому прапанавала фракцыі райвыканкому апратэставаць перад цэнтральнымі органамі пасеўныя пляны на 1931 год на прадмет іх зьніжэньня.

Праўленьне Барысаўскага ЦРК не перабудоўвала работы каапэрацыі ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду і праводзіла правапартуністычную практыку ў сваёй дзейнасьці.

Гарсавет выдаў справаздачу, пасьпіўшы яе дзяляцкімі бескаштоўнымі ярлыкамі і фактамі, сьвядома абыйшоўшы моўчкі палітычныя пытаньні барацьбы за генэральную лінію партыі. У сваёй справаздачы гарсавет паказаў свой яўна апартуністычны твар.

Райком на гэтыя факты не рэагаваў, чым, па сутнасьці, санкцыянаваў апартуністычную практыку ў рабоце ЦРК і гарсавету. Гэта нішто іншае, як рэзультат адлегласьці работы на разгортваньні самакрытыкі. Але сказаць толькі так, —будзе непраўдападобна. Правільна будзе, калі мы скажам, што гэта рэзультат душэньня і грубага, недапушчальнага заціску самакрытыкі з боку парткіраўніцтва. Закасьцянелы, вядомы яшчэ па Мазыры, душыцель самакрытыкі Сасноўскі распарадзіўся канфіскаваць друкаваны лісток выяной рэдакцыі газ. «Кооперативная жизнь», у якім быў сканцэнтраваны агонь пралетарскай самакрытыкі па недахопах у рабоце ЦРК, па яго апартуністычнай практыцы. Лісток быў канфіскаваны. Душыцелі самакрытыкі сьвяткавалі перамогу.

Дэзарыентацыя партыйных мас—замест бальшавіцкага рэагаваньня

«Зьвязда» (№ 24 ад 26 студзена) матар'ялямі сваёй брыгады сыгналізавала Барысаўскай арганізацыі і ўсёй КП(б)Б аб палітычных правалах у кіраўніцтве партарганізацыі Барысаўскага раёну, аб праяўленьні правапартуністычнай практыкі ў рабоце райкому, аб грубым заціску самакрытыкі з боку кіраўнікоў арганізацыі. Здавалася-б, што пасьля гэтага сыгналу кіраўніцтва прыме ўсе меры для таго, каб на канкрэтных фактах праяў апартуністычнай практыкі ў сваёй рабоце, як мага лепш падняць масы на змаганьне супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на далым этапе і «левых» загібаў і прыміраніцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Здавалася-б, што кіраўніцтва прыме ўсе меры, якія ад яго залежаць, у справе правільнай арыентацыі, мас на пытаньнях разгортваньня самакрытыкі. І, нарэшце, здавалася-б, што пасьля сыгналу «Зьвязды» кіраўніцтва будзе ачышчана ад апартуністаў і душыцеляў самакрытыкі.

Але-ж, што атрымалася?

Карэспандэнцыя «Зьвязды» — «Трывожны сьтнал з Барысава» была прадметам спэцыяльнага абгаварваньня на аб'яднаным пленуме РК і РКК КП(б)Б. ЦО КП(б)Б—«Зьвязда» чакала ад пленуму зусім выразнага бальшавіцкага адказу на пастаўленыя карэспандэнцыяй пытаньні, чакала неадкладнага рэагаваньня на наданыя факты, і, галоўнае, правільнай арыентацыі партыйных мас у пытаньнях змаганьня за генэральную лінію партыі і канкрэтных крокаў па мабілізацыі мас на бязьлітаснае выкарчоўваньне правапартуністычнай практыкі. Тым больш, што сыгналы «Зьвязды» знайшлі водгук у выступленьні сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча, які абрушыўся з усёй бальшавіцкай ярасьцю на правую практыку і факты заціску самакрытыкі, што мелі месца ў Барысаўскай арганізацыі. Але пастанова пленуму, прынятая пасьля ад'езду тав. Шаранговіча, не дала простага адказу на пастаўленыя радам абуральных фактаў пытаньні, ня ўлічыла іх (гэтых фактаў) пры ацэнцы лініі і работы бюро РК. Пастанова, прызнаючы фармальна карэспандэнцыю «Зьвязды» бяз усякіх агаворак правільнай, у далейшым разьвіцьці свайго зьместу зьнімала палітычную значнасьць сыгналу ЦО — «Зьвязды» і гэтым самым дэзарыентавала партыйныя масы.

Алілюйшчыкі ад парткіраўніцтва, фармальна прызнаўшы свае памылкі на пленуме, уявілі, што яны досыць пасамакрытыкаваліся, што яны ўсё зрабілі для разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. Яны па ўласьцівай усім апартуністам ідэалёгіі не разумеюць, што толькі «сапраўдная выбарнасьць партыйных і прафсаюзных органаў, поўная магчымасьць зьмяшчэньня любога сакратара, любога бюро, камітэту і г. д. створыць сталы кантроль мас, зможа зьняць бюракратычныя нарасты з нашага апарату і зьнішчыць магчымыя праяўленьні бюракратычнага заціску, кампанейскае «кругавое парукі», чыноўніцкай угодлівасьці, самадурства, забываньня інтарэсаў мас і мяшчанскае заспакоенасьці. Бяз гэтых мерапрыемстваў лёзунг крытыкі і самакрытыкі ператворыцца ў папяровую адпіску, якая толькі скампраметуе ў вачох мас і гэты лёзунг, і кіраўніцтва партыі, і самую партыю» (з адозвы ЦК УсеКП(б) аб самакрытыцы).

Імена ў бюракратычную адпіску ператвораи лёзунг аб самакрытыцы пастановай пленуму Барысаўскага райкому. Кіраўнікі пленуму (якія, да рэчы, і радагавалі пастанову) ня толькі не пайшлі насустрач патрабаваньням мас партыйнага актыву арганізацыі, а, наадварот, пайшлі ў разрэз з імі, бяручы з бою зацьвярджэньне кожнага пункту «славутай» пастановы. Падкрэсьліваем, што пастанова, якая дэзарыентуе масы, была працягнута (іменна працягнута) на пленуме кіраўнікамі, якія, груба сказіўшы ўстаноўкі выступленьня тав. Шаранговіча на пленуме і скарыстаўшы яго ад'езд, адступілі ад прызнаньня сваіх памылак, якія (прызнаньні) зрабілі на першых пасяджэньнях пленуму пад нацiскам мас.

«Зьвязда» ў мэтах правільнай арыентацыі ўсяе партарганізацыі вымушана была выступіць са спэцыяльным артыкулам, што ёй і было зроблена ў № 32 ад 3 лютага бяг. году. У сваім артыкуле «Замест самакрытыкі—самастрахоўка» «Зьвязда» паказвала Барысаўскай парт-арганізацыі на няправільнасьць пастановы, досыць падрабязна растлумачваючы яе сутнасьць, расшыфроўваючы завуаляванае апартуністамі ў яе зьмесьце змазваньне памылак кіраўніцтва, змазваньне палітычнага значэньня сыгналаў ЦО—«Зьвязды». Адначасова ў артыкуле выкрыта супярэчнасьць паміж радам пунктаў пастановы.

У пошуках апраўданьня сваіх апартуністычных памылак

Кіраўніцтва райкому, замест таго, каб неадкладна прыступіць да выпраўленьня і гэтых буйных палітычных памылак, замест таго, каб яшчэ шырэй разгортваць самакрытыку, пайсьці ў масы сваіх памылках, накіроўваць актыўнасьць і энэргію мас на змаганьне за правільную лінію партыі,—кіраўніцтва стала на шлях нізкага, нявартага ня толькі кіраўнікоў, але і кожнага члена партыі, генэфтмахэрства. Райкомшчыкі пайшлі ў парткалектывы з апэляцыяй, пайшлі шукаць падтрыманьня і апраўданьня сваіх апартуністычных памылак. Мы ніколькі не сумняваемся ў тым, што апартуністы ў гэтых сваіх мэтах скарыстоўвалі самыя нізкія формы, скажаді партыйныя ўстаноўкі і карысталіся самымі агіднымі мэтадамі паклёпу на ЦО—«Зьвязду», з мэтай прапіхаваць ёй і яе ўстаноўкам партыйныя масы. Мы ніколькі не сумняваемся і ў тым, што апартуністы з райкому пайшлі з загадзя напісанымі праектамі пастановы ў бюро буйнейшых парткалектываў для таго, каб навязваньнем і нацiскам прымушаць хоць сэкцыя-такія пункты і гэтым самым хоць колькі-небудзь апраўдацца ў сваіх апартуністычных памылках.

Перад намі рэзалюцыя пасьлядзьня бюро партналектыву фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», прынятая з лютага, наконт нашага артыкулу—«Замест самакрытыкі—самастрахоўка».

Што гэта за рэзалюцыя?

Досыць падаць некалькі пунктаў, каб зразумець, што гэта за дакумент. Рэзалюцыя, згаджаючыся з правільнасьцю выпадаў артыкулу аб суняручасьнасьці пастановы пленуму, бяро на слабо адказваецьць і сьмепасьць сьцьвярджаць, што ацэнка, даная «Зьвяздой работам пленуму, няправільная. Адтак, галоўнае ў рэзалюцыі ня гэта. Гэта можа быць толькі прадуктам палітычнай бізарукасьці, наўменьня дыялектычна падыходзіць да пытаньня і па-бальшавіцку яго аналізаваць. Галоўнае тут у другім. У рэзалюцыі бюро парткалектыву «Чырвонай Бярэзіны» ёсьць такі пункт: «Бюро парткалектыву лічыць артыкул у «Зьвязьдзе» ад 26 студзеня ў асноўным правільным; адначасова адзначае, што ў матар'ялах маецца рад вываду, з якімі бюро парткалектыву не згаджаецца».

З якіх гэта часоў?! Як гэта здарылася?! Пленум райкому прызнаў артыкул «Зьвязды» ад 26 студзеня правільным, не зрабіўшы пры гэтым ніякіх агаворак.

Дзе-ж элементарная лёгіка?

Па крывых, непартыйных дарожках

Зразумела, лёгікі, нават самай элементарнай, ня можа быць там, дзе апартуністы шукаюць хоць-бы самай маленькай лазейкі для апраўданьня сваіх злачынных дзеньняў. Такое якраз становішча мы маем і тут. Барысаўскія райкомшчыкі, кінуўшы пад ногі сваё цыцыканьні памылак, пачалі шукаць лазейкі для таго, каб адступіць назад на рапейшыя пазыцыі ў пытаньнях як самакрытыкі, так і змаганьня з правапартуністычнай практыкай. І гэту лазейку апартуністы знайшлі ва ўпамянёным вышэй пункце рэзалюцыі бюро парткалектыву «Чырвонай Бярэзіны». Імкнучыся кашырыць сабе шлях, апартуністы ідуць з практамі пастановы аналягічнага зьместу ў другія парткалектывы (да рэчы, бюро парткалектыву разаслу «Камінтэрн» прыняло аналягічнага зьместу рэзалюцыю). І горш за ўсё абуразоча тое, што райкомшчыкі перапрацыі рэзагаваньне на артыкул «Зьвязды» ў свапасаблівую «кампанію» супроць ЦО КП(б)Б—«Зьвязды». Але гэта мы закранаем між іншым.

Зьвернемся да маноўраў апартуністаў і душыцеляў самакрытыкі, выкуленых у рэзалюцыі бюро парткалектыву «Чырвонай Бярэзіны». У пунктах 3 і 4 ёсьць такія сказы: «Бюро парткалектыву лічыць, што сучасны склад бюро РК і прэзыдыуму райКК здольны сталь на чале кіраўніцтва Барысаўскай арганізацыі КП(б)Б і ажыцьцяўляць правільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі...» і далей у пункце 4: «Бальшавіцкае прызнаньне сваіх памылак з боку РК і райКК, у прыватнасьці, прызнаньне сваіх памылак сакратаром РК Сасноўскім і старшынёй райКК—тав. Казэчэнкам павінна паслужыць для яшчэ большага разгортваньня сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі ў Барысаўскай арганізацыі».

Як можна аб гэтым сказаць, не адкінуўшы тыя неабгрунтаваныя факты апартуністычнай практыкі, якія былі ў кіраўніцтве райкому, не адкінуўшы таго, што заўзяты апартуніст і душыцель самакрытыкі Сасноўскі не паказаў, як падкрэсьлівае «Правда», ніякіх адзнак выпраўленьня сваіх памылак пасьля гравалаў на рабоце ў Мазырскай арганізацыі.

Увогуле рэвалюцыя, працягнутая райкомшчыкамі на бюро парткалектыву фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», зьмуляецца выразным сьледам маноўраў апартуністаў, іх імкненьнем адступіць на свае папярэднія, непартыйныя, пазыцыі. Рэзалюцыя яркі дакумант, накіраваны супроць крытыкі ЦО КП(б)Б—«Зьвязды». Закранаючы гэту вялікасьць справы, ні у якім разе нельга абмінуць і таго, што апартуністы Барысаўскага райкому імкнуцца зацісьнуць самакрытыку з боку сваёй раённай газэты «Бальшавік Барысаўшчыны». У канцы рэзалюцыі Сасноўскім і К° працягнуты такі пункт аб «Бальшавіку Барысаўшчыны»:

«Выйшаўшы нумар 4 лютага 1931 году не дае прадзяльнай ацэнкі пастановам аб'яднанага пленуму і сваімі «шапкамі» і загалоўкамі, заблытвае перадавіцай дэзарыентавала партарганізацыю, расхаладжвоча мабілізацыю партыйных мас вакол правільных у асноўным пастаноў пленуму райкому і рэйКК. Бюро парткалектыву патрабуе ад бюро райкому прыняць меры ў адносінах да рэдакцыі газэты «Бальшавік Барысаўшчыны», каб забясьпечыць спалучэньне інфармаваньня партарганізацыі аб прынятых пастановах райкому».

У чым блытанасьць перадавога артыкулу? Хіба ў тым, што ён не пяе дыфірамбаў апартуністам у тым, што дае бальшавіцкі аналіз работам пленуму? Мы лічым, што «Бальшавік Барысаўшчыны» ён і вядзе ў асноўным правільную партыйную лінію, лічым, што газэта зусім правільна зрабіла, калі зьмянчае палітычна-шкодныя пастановы райкому з зацвагай рэдакцыі.

Ударыць па брудных лапах апартуністаў і глушыцеляў самакрытыкі

Для нас зусім ясна тое, што апартуністы і душыцелі самакрытыкі ненавідзяць бальшавіцкі друк, які з усёй рашучасьцю разгортвае пралетарскую самакрытыку. Адно незразумела. Хто даў права апартуністам рабіць спробы арганізоўваць паход супроць друку, заціскаць самакрытыку на старонках газэты? Прымаць беспалетаўна арганізацыйныя меры ў адносінах рэдакцыі? Гэта нябывалы ў гісторыі партыйнасавецкага друку ганебны факт! Таму, што газэта на сталь бяспрынцыпным дадатках групы апартуністаў, ня стала поплеч з душыцелямі самакрытыкі, апартуністы заціскаюць ёй рот арганізацыйнымі мерамі, штурхаюць на шлях апартунізму? Партыя гэтага зрабіць нікому не дазволіць. Партыя дасьць па брудных лапах апартуністаў, якія імкнуцца запляміць твар бальшавіцкага партыйнага друку.

Вышэй наданыя факты апартурнай двойнасьці кіраўнікоў Барысаўскай партарганізацыі лішні раз даводзяць тэндэнцыясьць кіраўніцтва барысаўскай арганізацыі стаць на чале змаганьня за баявую праграму трэцяга году пяцігодкі. Сваімі манэўрамі і авантурнымі выпадамі кіраўнікі Барысаўскай арганізацыі на чало з Сасноўскім да канца, ва ўсёй сваёй паўнаце і выразнасьці паказалі свой твар непапрэймых апартуністаў, якім ня месца на кіруючай рабоце. Паводзіны іх патрабуюць рашучае ўмяшальнасьці ЦКК.

Барысаўская, пралетарская, на сваім складзе, арганізацыі КП(б)Б—бальшавіцкае кіраўніцтва!

Барысаўская арганізацыя была і застацца верным атрадам КП(б)Б у барацьбе за нязгыльнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, у барацьбе супроць правых і «левых» апартуністаў і крымірэнцаў. Барысаўская арганізацыя, ачысьціўшы свае кіраўніцтва ад апартуністычнай шкарлупы, будзе на-бальшавіцку змагацца за высокія тэмпы сацыялістычнай індустрыялізацыі і сацыялістычнае рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Умацняючы пацік на кулацтва да поўнага яго ліквідацыі як класы, партарганізацыя будзе сыстэматычна ачышчаць свае рады адкулацкіх агентаў—правых апартуністаў, «левых» загібшчыкаў і усіх тых, хто ня можа, ці нездольны ажыцьцяўляць генэральнай лініі партыі.

Слова фактам

Парткіраўніцтва віцебскай арганізацыі не забясьпечыла разгортваньня пралетарскай крытыкі

Важнейшым сродкам праверкі ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і бязьлітаснага змаганьня супроць апартунізму за ўсіх ігро правах, супроць бюракратызму, шкодніцтва, разгільдзяйства ў рабоце і іншых негдаровых момантаў —зьяўляецца сьмелае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі зьнізу даверху і зьверху данізу. Пралетарская самакрытыка — найважнейшая, неадлучная частка змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за высокія бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Вось гэтага значэньня самакрытыкі не разумее кіраўніцтва віцебскай гарадзкой партыйнай арганізацыі. Каб даведацьці поўную бясспрэчнасьць правільнасьці такой характарыстыкі, неабходна зьвярнуцца да некаторых фактаў.

Пытаньнем становішча разгортваньня самакрытыкі ў Віцебскай партарганізацыі ў пачатку 1930 году займалася ЦКК, якая, правёўшы выбарчае абследаваньне частка парт'ячэек прадпрыемстваў і ўстаноў па дакладу АКК, канстатавала, што дырэктывы партыі аб рашучым разгортваньні самакрытыкі ў віцебскай арганізацыі праводзяцца ўсім пасдавальнікоў. Прэзыдыум ЦКК даў рад выразных дырэктыў у справе разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. Адтак, кіраўніцтва віцебскай партарганізацыі не забясьпечыла бальшавіцкага ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў, на былі мабілізаваны ў выстарчальнай меры партыйная арганізацыя і шырокія рабочыя масы на разгортваньне самакрытыкі. Гэта бальшавіцкая зброя ня стала штодзённым мэтадам у рабоце. Галушнелі пралетарскай самакрытыкі не сустракалі на мясцох досыць рашучага адпору.

У зьвязку з такім становішчам і выяўленым прасьледваньнем рабкораў, у верасьні мінулага году ЦКК паўторна абмеркавала пытаньне аб становішчы самакрытыкі ў віцебскай арганізацыі і, прызнаўшы незадавальняючае выкананьне дырэктыў, даных у студзені 1930 г., запрапанавала віцебскаму гаркому мабілізаваць партыйную арганізацыю на разгортваньне бальшавіцкае самакрытыкі, даючы рашучы адпор усялкім найменшым спробам яе заціску.

З таго часу прайшло каля 5 месяцаў, а належнага пералому ў справе разгортваньня самакрытыкі няма. Рад буйнейшых прарываў у выкананьні прамфінпляну, рад фактаў грубага скажэньня партыйнай лініі некаторымі ячэйкамі і паасобнымі камуністамі віцебскай арганізацыі сыгналізуюць аб недаацэнцы палітычнага значэньня самакрытыкі, як важнэйшай зброі ў змаганьні за пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Толькі адсутнасьцю самакрытыкі можна растлумачыць наяўнасьць абуральных фактаў грубага скажэньня партыйнай лініі ў саспаборніцтве на акупарнай фабрыцы, якія (факты) нядаўна былі выкрыты друкам. Ня менш паказальны мі па сваёй недапушчальнасьці зьяўляецца нядаўна выкрытыя факты скажэньня партыйнай лініі ў нацыятаньні на мэблевай фабрыцы. Там, у сувязі з узьнікшымі спрэчкамі паміж найбольш адсталымі групамі рабочых - беларусаў і яўрэяў аб тым, каму дасталася больш ордэраў на атрыманьне дэфіцытных тавараў, парт'ячэйка вылучыла парытэтную камісію з прадстаўнікоў... па нацыянальных адзнаках, якая ня толькі не ўзьняла гэтага пытаньня на адпаведную палітычную вышыню ў сэнсе інтэрнацыянальнага выхаваньня, але выразыла разьмяркоўваць тавары... на нацыянальнай адзнацы. Ячэйка такія вывады санкцыянавала.

Наколькі слаба разгорнута самакрытыка ў радзе парт'ячэек віцебскай арганізацыі паказвае перавыбарчы сход на заводзе «Камінтэрн». На гэты сход сабралася 260 чалавек, а да канца сходу засталося толькі 60. У часе сходу раздаваліся з месц антысавецкія рэплікі. Характэрна, што прысутныя на сходзе камуністы ня толькі не асудзілі выказак клясавага ворага, але некаторыя з іх (камуністаў) нават падтрымлівалі іх. Адсутнасьць партыйнай чуласьці і клясавай пільнасьці з боку раду камуністаў парт'ячэйкі заводу «Камінтэрн» — паказальнік зусім слабай барацьбы ў гэтай ячэйцы з апартунізмам—агентурай клясавага ворага, паказальнік таго, што бальшавіцкая зброя — вастрыё пралетарскай самакрытыкі не накіроўвалася на барацьбу з усіламі ад лініі партыі.

З шматлікіх фактаў заціску самакрытыкі, меўшых месца за апошні час у Віцебску, былі такія выпадкі, калі дырэктар акупарнай фабрыкі Рубін за крытыку недахопаў работы на прадпрыемстве зьнімаў з работы вылучэнцу. Прычым, на гэтыя ўчынкі ні парт'ячэйка, ні фабком не рэагавалі. Супрацьлеглы разгортваньню самакрытыкі на заводзе «Чырвоны мэталіст» парвалі дзьво насьценныя газэты. З мэтай пазбавіцца крытыкі там шырока практыкавалася перакідка рабкораў з аднаго цэху ў другі, адмаўленьне рабкорам у прыёме на работу і ўзьмацваўся рад іншых мэтадаў заціску самакрытыкі. Сакратар парт'ячэйкі ЦРК — Назвыч адсутнасьць самакрытыкі імкнуўся апраўдаць тым, што ў іх няма... чырвонага кутка.

Такое ігнараваньне дырэктыў партыі аб разгортваньні самакрытыкі радам ячэек віцебскай арганізацыі, неразуменьне не значэньня ў сыстэме ўсёй работы зьяўляецца адной з асноўных прычын прарываў па важнейшых вучастках работы, прарываў у выкананьні прамфінпляну. Прамфінплян за студзень на заводзе «Чырвоны мэталіст» выканан толькі на 43.7 проц., на акуларнай фабрыцы — на 76.9 проц., на іголкавай — на 70.6 проц., шэйнай — 58 проц. і на «Дзьвіне» за першыя дзьве дэкады — на 79.8 проц.

Рэагуючы на факты заціску самакрытыкі ў віцебскай партарганізацыі. Такі падыход ня спрыяе разгортваньню самакрытыкі, не мабілізуе партыйных масы, а дэзарыентуе іх.

Аб тым, што кіраўніцтва віцебскай гарадзкой партарганізацыі не забясьпечывае разгортваньня бальшавіцкае самакрытыкі, што ў гэтай справе наглядзецца масабоязь, сьведчаць яшчэ і тыя «дыпляматычныя» устаноўкі сакратара РК тав. Чычэрава, якія ён вакольным пародкам даваў рэдактару газэты «Віцебскі Пралетары». Напярэдадні пленуму Чычэраў выклікаў да сябе рэдактара газэты і ў гутарцы з ім заявіў:

«У нашай арганізацыі няма правільнага разуменьня самакрытыкі; калі што здарэцца, усе бягуць хутчэй у рэдакцыю з допісамі, а да мяне не заходзяць».

У такой пастаноўцы пытаньня яркі адлюстроўваецца неразуменьне самакрытыкі самім сакратаром гаркому.

Калі да ўсіх паданых фактаў дадаць, што пасьля выпраўленьня гаркомам апартуністычнай справаздачы гарсавету, апошняя аставалася прасякнутай апартуністычным дзяляцтвам і трасклучым пахвальствам, без усякіх самакрытычных адзнак і недахопаў у рабоце, напрошваецца бясспрэчны вывад:

Кіраўніцтва віцебскай гарадзкой парт-арганізацыі не забясьпечыла выкананьня дырэктыў ЦКК аб разгортваньні самакрытыкі.

Я. ЭЙДЭЛЬМАН.

АПОШНІЯ ДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ МЕНГАРСАВЕТУ

БЫЦЬ УДАРНАЙ БРЫГАДАЙ НА ПАСТОХ ПЯЦІГОДКІ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ПАЛЕПШЫЦЬ КІРАЎНІЦТВА АПОШНІМ ЭТАПАМ КАМПАНІІ

РАШУЧА ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Амаль на ўсіх справаздачных сходах рабочыя масы прызнані, што ПА АСНОЎНЫХ ГАЛІНАХ гаспадарчага і культурнага будаўніцтва РАБОТА МЕНГАРСАВЕТУ БЫЛА НЕЗДАВАЛЬНЯЧАЙ. У рэзалюцыях па справаздачы аднадушна адзначалася, што Менгарсавет 12-га скліканьня ня стаў на чале ўзросшай актыўнасьці рабочых мас, заставаўся пасыўным глядачом гэрайчнага змаганьня пралетарыяту за пяцігодку за чатыры гады, за новыя сацыялістычныя формы працы.

Вось чаму дзесяткі тысяч рук рабочых выбаршчыкаў упісалі генэральным пунктам у наказ гарсавету 13-га скліканьня: САВЕТ ПАВІНЕН ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ТВАРАМ ДА САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА.

Выкананьне гэтага баявога наказу зьяўляецца АСНОЎНАЙ, АКТУАЛЬНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ ГАРСАВЕТУ НОВАГА СКЛАДУ. БЕЗ РАШУЧАГА ПАВАРОТУ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ НЕЛЬГА ЎЗЬНЯЦЬ РОЛЮ САВЕТУ Ў ЗМАГАНЬНІ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, НЕЛЬГА ПЕРАБУДАВАЦЬ РАБОТУ САВЕТУ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ВЯЛІЗАРНЕЙШЫМІ ЗАДАЧАМІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ.

Савет, як масавы орган дыктатуры пралетарыяту, ня можа задаволіцца толькі зацьвярджэньнем пленумаў, асноўных лімітаў і законапалажэньняў, але ЁН ПАВІНЕН МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА СКЛАДАНЬНЕ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ; савет ня можа задаволіцца толькі адной праверкай выкананьня дырэктыў, але ЁН, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ, МАБІЛІЗУЕ МАСЫ НА НЕПАСРЭДНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТЫХ-ЖА ДЫРЭКТЫЎ, НА КІРОЎВАЕ ЭНЭРГІЮ МАС НА ВЫРАШЭНЬНЕ КАНКРЭТНЫХ ЗАДАЧ ДНЯ.

Такой перабудовы нельга дасягнуць без рашучай барацьбы з апартунізмам, бюракратызмам, коснасьцю, якія ўкараніліся ў паасобных зьвеньнях Менгарсавету, без арганізацыі масавага рабочага кантролю, без актыўнай работы сэкцый і дэпутацкіх груп.

Да гэтага часу работа сэкцый Менгарсавету была Ў ЗАНЯПАДЗЕ. Віна ў бязьдзейнасьці сэкцый падае выключна на прэзыдыум гарсавету, які не накіроўваў іх работу па патрэбным рэчышчы. Сэкцыі мінулым кіраўніцтвам гарсавету скарыстоўваліся звычайна для тэхнічных даручэньняў, «падрыхтоўваючы пытаньні на вырашэньне прэзыдыуму гарсавету» (са справаздачы Менгарсавету). Работа сэкцый і Менгарсавету ў цэлым ня ўвязвалася, таму сэкцыі і прэзыдыум гарсавету нярэдка працавалі над рознымі пытаньнямі, ня зьвязанымі з канкрэтнымі задачамі дня. ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ЗУСІМ НЯ БЫЛІ АРГАНІЗАВАНЫ.

Мінулае кіраўніцтва Менгарсавету лічыла, што ТАКАЯ пастаноўка работы «давала магчымасьць гарадзкому савету мець сталую сувязь з усімі працоўнымі масамі» (?) (са справаздачы).

Наўрад ці патрэбна даводзіць, што ТАКАЯ «сувязь» з рабочымі масамі, што такое «кіраўніцтва» выпрацоўваецца ні ў якім разе ня можа спрыяць узмацненьню аўтарытэту сэкцый і павышэньню зацікаўленасьці рабочых да масавай савецкай работы.

Сапраўды павярнуцца тварам да вытворчасьці, палепшыць масавую работу саветаў, пашырыць удзел рабочых-выбаршчыкаў у рабоце савету магчыма толькі ў тым выпадку, КАЛІ СЭКЦЫІ І ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ ЗНОЙДУЦЬ САБЕ МОЦКУЮ АПОРУ НЕПАСРЭДНА НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ. Пакончыць з папяровымі дырэктывамі, падыйсьці шчыльна да вырашэньня канкрэтных задач дзнага прадпрыемства, стаць арганізатарам і кіраўніком саспаборніцтв і ўдарніцтва МОЖНА ТОЛЬКІ ПРЫ ЎМОВЕ, КАЛІ ПРЫСТУПЯЦЬ ДА РАБОТЫ НІЗАВЫЯ ЗЬВЕНЬНІ ГАРСАВЕТУ — ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ — АПОРНЫЯ ПУНКТЫ САВЕТУ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Тут няма чаго баяцца, што адзін і той-жа капектыў рабочых будзе ўцягнуты ў масавую работу двума органамі — савецкімі (дэпутацкія групы) і прафсаюзнымі (заўком).

Практыка іншых гарадоў СССР паказала, што там, дзе работа праводзіцца плянава, сумесная работа дэпутацкіх груп і заўкому пад кіраўніцтвам парткалектываў дае вялікія посьпехі. Дэпутацкія групы МОГУЦЬ І МАЮЦЬ ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЬЦЬ выконваць работу, якая ня будзе ўключацца ў плян работы заўкому. Але ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА ДЭПУТАЦКІХ ГРУП НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ПАВІ

ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ТАВАРНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

Дзіцячыцы-ўдарніцы за разьліўкай малака (калгас «Настрычніцкая рэвалюцыя»)

Малочныя і сьвіныя таварныя фэрмы — важнейшы вагар вырашэньня праблемы мяса і малака

ПРАВІЛЬНЫМ АБАГУЛЬВАНЬНЕМ ПРАДУКЦЫЙНАЙ ЖЫВЁЛЫ, РАШУЧАЙ БАРАЦЬБОЙ З ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДАЦЭНКАЙ ГЭТАЙ СПРАВЫ І „ЛЕВЫМІ“ ПЕРАГІБАМІ — ДАБ'ЕМСЯ МАГУТНАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ КАЛГАСНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Аб абагуленьні кароў у калгасах і стварэньні высокатаварных фэрм

На сваіх гістарычных і натуральных умовах БССР мае ўсе магчымасьці для хутчэйшага вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, г. зн. праблемы мяса і тлушчаў.

XVI зьезд нашай партыі ў сваіх пастановах даў выразную дырэктыву «забясьпечыць узьніцьце і ўзмацненьне разьвіцьця жывёлагадоўлі шляхам перш за ўсё арганізацыі спэцыяльных жывёлагадоўчых саўгасаў, аналёгічных збожжавым саўгасаў, масавага стварэньня высокатаварных калгасных фэрм і хуткага вырашэньня кармавой базы».

Ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, мы дабіліся ўже значных посьпехаў як у галіне саўгаснага будаўніцтва, так і арганізацыі калгаснага абагуленага стада. Па БССР на 1 студзеня 1931 г. вылучана 560 малочна-жывёлагадоўчых спэцыялізаваных калгасаў, дзе абагулена 39.400 калгасных кароў; 586 спэцыялізаваных сьвіногадоўчых калгасаў, у якіх пастаўлена 31.500 сьвінаматак.

У 1931 г. тэмп арганізацыі жывёлагадоўчых гаспадарак яшчэ больш бурны. Колькасьць кароў у спэцыялізаваных малочна - жывёлагадоўчых калгасах будзе павялічана да 78 тыс., якія павінны даць ня менш 50 тыс. тон малака. У спэцыялізаваных сьвіногадоўчых калгасах будзе пастаўлена 150 тыс. сьвінаматак і здана дзяржаве ня менш 210 тыс. адкормленых сьвіней для рабочага забесьпячэньня.

Вынікі першага году арганізацыі сацыялістычнай жывёлагадоўлі і плянавыя меркаваньні на 1931 год, прынятыя масамі калгасьнікаў, ушчэнт разьбілі апартуністычныя «тэорыі» правых ухілістаў і «левых» загібшчыкаў і ярка даказалі правільнасьць генэральнай лініі партыі, накіраванай на стварэньне буйных жывёлагадоўчых саўгасаў і высокатаварных калгасных фэрм.

Бальшавіцкая праграма трэцяга году пяцігодкі патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў. Аднак, першы месяц трэцяга рашаючага году пяцігодкі паказаў, што нізавыя партыйныя і савецкія арганізацыі яшчэ ня ўсюды пераключыліся на баявыя тэмпы работы па выкананьні дырэктыў партыі і ўраду ў галіне арганізацыі сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Матар'ялы з месц гавораць аб недаацэнцы ў радзе раёнаў гэтай важнейшай справы. Ва многіх калгасах ня створаны належныя ўмовы для разьвіцьця жывёлагадоўлі (не ацеплены хлявы, ня зроблены кармушкі і г. д.), няма адпаведнага догляду жывёлы, асабліва маладняка, цялят, парасят. Некаторыя калгасы ня ўжываюць мер да далейшага пашырэньня стада жывёлы, адмаўляюцца ад жывёлы, што перадаецца ім загатоўчымі арганізацыямі.

Ёсьць і такія ганебныя факты, калі абагуленая жывёла разбазарваецца, вынішчаецца. Некаторыя праўленьні калгасаў перадаюць парасят калгасьнікам для ўласнага спажываньня. Гэта часта робіцца пад носам раённых устаноў і нават з іх ведама.

Трэба рашуча пакончыць з падобнымі выпадкамі, якія, бязумоўна, робяцца пад уплывам агітацыі кулацкіх і паогул варожых калгаснаму будаўніцтву элемэнтаў.

Пастаўленыя партыяй вялікія задачы па стварэньні высокатаварных калгасных фэрм могуць і павінны быць выкананы пры правільным правядзеньні абагуленьня жывёлы і пры стварэньні належных умоў для ўтрыманьня абагуленай жывёлы.

Нельга дапускаць летаньніх памылак пры арганізацыі калгасаў, калі рад калгасаў дапусьціў адтэрміноўваньне абагуленьня другіх і трэціх кароў, коняй і рабочых валоў.

Напрыклад, Камарынскі раён у мінулым годзе зусім не абагульваў кароў, а зараз, калі пачаў абагульваць, дапусьціў, бязумоўна, шкодны перагіб у другі бок: абагуленьне жывёлы даручылі правесьці... міліцыі. На калгасьнікаў, якія добраахвотна не абагульвалі сваіх другіх і трэціх кароў, міліцыя складала акты і перадавала справу ў суд. (Зразумела, што вярхоўны суд скасаваў такія справы).

Гэтага мала. Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у такім абураючым галавацяпстве.

На сутнасьці і цяпер многія раёны ідуць на лініі найменшага супраціўленьня і паўтараюць памылкі Камарына. Асабліва дрэнна стаіць справа з абагуленьнем жывёлы ў Лепельскім і некаторых іншых раёнах. Лепельскі раён па калектывізацыі ідзе пасьля Менскага раёну наперадзе ўсіх іншых раёнаў. Так калектывізавана ўжо кала 40 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў. Але насенныя фонды ў новых калгасах поўнасьцю на створаны, другія каровы і нават коні не абагулены. Ёсьць пагроза, што ў Лепельскім і ў некаторых іншых раёнах можа паўтарыцца «рулька ў калектывізацыі», калі мясцовыя партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі сапраўды, па-бальшавіцку ня возьмуцца за кіраўніцтва калгасным рухам, за яго пашырэньне, за арганізацыю га

новых калгасаў на аснове разгортваньня масавай работы.

Некаторыя раённыя арганізацыі на практыцы трымаюць курс на праваапартуністычны самацёк, не арганізуюць калгаснага будаўніцтва, а толькі «загадваюць» ім. Трэба рашуча пакончыць з самацёкам у калектывізацыі, махровай праваапартуністычнай практыкай.

У мінулым годзе спэцыялізаваныя малочна-жывёлагадоўчыя калгасы ад сваіх фэрм здалі для рабочага забесьпячэньня ў сярэднім па 290 літраў малака ад кожнай абагуленай каровы. Некаторыя-ж калгасы здалі значна больш прадукцыі. Так, напрыклад, калгас «Прабуджаная праца», Менскага раёну, здаў 1.072 літры ад кожнай каровы, «Чырвоны сормавец», Магілеўскага раёну — 961 літр, «Іскра», Шклоўскага раёну — 800 літраў, «Колас», Лупалаўскага раёну — 700 літраў. 13 калгасаў вакол Менску здалі ў сярэднім па 702 літры ад каровы.

Але ёсьць многа і такіх калгасаў, якія амаль што нічога ня здалі ад сваіх кароў дзяржаве для рабочага забесьпячэньня.

Трэба падкрэсьліць, што ў сельскагаспадарчых арцелях, дзе першыя каровы па статуце не абагульваюцца, уся абагуленая жывёла зьяўляецца таварнай, г. зн., што ўся прадукцыя абагуленай жывёлы павінна прадавацца дзяржаве.

Таварная жывёла калгасу арганізуецца ў спэцыяльную калгасную фэрму і ў далейшым павялічваецца за лік купленай жывёлы, дадатковага абагуленьня, гадоўлі маладняка і г. д.

Трэба ўстанавіць, як правіла, што спажывецкае стада жывёлы ў спэцыялізаваных малочных жывёлагадоўчых калгасах не павінна перавышаць 20-30 проц. стада жывёлы таварнай калгаснай фэрмы.

Пры такім падыходзе мы выкананем дырэктыву партыі і створым высокатаварныя фэрмы калгасаў.

Калгасьнікі самі зацікаўлены ў павялічэньні таварнай жывёлы, бо ўсе прыбытні ад гэтай жывёлы ідуць для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі і пашырэньня іх калектыўнай гаспадаркі.

Многія калгасьнікі ўжо ўсьвядомілі вялікую карысьць ад абагуленых высокатаварных фэрм і самі выносяць пастановы аб абагуленьні сваіх кароў і сьвіней. Пры буйным стадзе патрабуецца менш рабочых рук на догляд, можна лепш арганізаваць правільнае кармленьне і г. д.

Начынаньне калгасьнікаў аб абагуленьні першых кароў і сьвінаматак трэба ўсяляк пахваліць і дапамагчы яго праводзіць.

Кулак і яго агентура ўнутры калгасаў усялякімі мерамі імкнуцца сарваць арганізацыю высокатаварных калгасных фэрм, як і паогул пасьпяховае разгортваньне сацыяльнай калектывізацыі і на базе не ліквідацыі кулацтва, як класы.

Праваапартуністычная стаўка на самацёк і «левыя» загібы ў гэтай важнейшай справе дапамагаюць кулаку.

Партыйныя арганізацыі на мясцох павінны забясьпечыць поўнае выкананьне пастаноў XVI зьезду партыі аб стварэньні высокатаварных калгасных фэрм.

Г. Самусевіч.

Дзяляцкі даклад старшыні Слуцкага РВК

адлюстроўвае яго праваапартуністычную практыку

Раённы зьезд саветаў даў рашучы адпор праваму апартуністу

СЛУЦАК. (Па тэлефону). Даклад аб рабоце ўраду на раённым зьезьдзе саветаў працягваўся звыш 2 гада. Тав. ГАЛАДЗЕД, апрача пытаньня аб міжнароднай палітыцы, ахарактарызаваў рад важнейшых гаспадарчых і палітычных задач, якія стаяць перад партыяй, рабочай клясай і працоўнымі сялянскімі масамі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Гэтыя задачы цяжкія, але магчымы да выкананьня, што бліскуча пацьвердзілі вынікі першых двух год пяцігодкі. Тав. Галадзед радам лічбаў ілюстраваў гэта сталавішча. Генэральная лінія партыі перамагае, правыя і «левыя» апартуністы пацярпелі паражэньне. Ня спыняць барацьбы з правай небясьпекай—галоўнай на даным этапе, і «левымі» загібамі—асноўная задача партыі.

Партыя паставіла задачу—закончыць калектывізацыю СССР к канцу пяцігодкі. Гэтай генэральнай задачы павінна быць падпарадкавана ўся работа ў вёсцы і сюды трэба накіраваць усе сілы партыі, рабочае клясы, вызьвалоўчы калектывізацыю з усімі чарговымі сельска-гаспадарчымі кампаніямі.

У далейшай часьці сваёй прамовы тав. Галадзед аналізаваў рад іншых практычных задач работы на вёсцы: падрыхтоўка да вясны, мабілізацыя сродкаў, пытаньне нацыянальнай палітыкі, аб кааперацыі, Чырвонай армії і г. д.

Зьезд з вялікай увагай заслухаў грунтоўны даклад тав. Галадзеда, насычаны вялікім фактычным матар'ялам і лічбовымі даткамі.

На працягу ўчарашняга дня на зьезьдзе адбываліся спрэчкі па дакладу ўраду. Выступала звыш 20 таварышоў. Спрэчкі адзначаліся глыбокім палітычным зьместам і былі насычаны здаровай самакрытыкай. Выступаўшыя прызналі, што тэмпы калектывізацыі ў раёне не забясьпечваюць выкананьня заданьня пленуму ЦК—калектывізаваць да вясны на 30 проц.

Па лініі загатовак, асабліва збожжа, ільнянага сена і валакна, а таксама пасу, у раёне поўны провал, абавязацельствы перад дзяржавай ня выкананы. Сельсаветы не папярнуліся па-сапраўднаму тварам да калгаснага руху, боязьнь кулака, тое што не давяла адпору яго антыкалгаснай агітацыі—тармозіць разьвіцьцё калгасаў.

Мабілізацыя сродкаў праходзіць зусім дрэнна. Гэтыя вялікія прарывы на Случчыне абавязваюць зьезд мабілізаваць масы на іх неадкладнае выкананьне. Выступаўшыя ў спрэчках абавязаліся абясьсіліць сябе ўдарнікамі і, вярнуўшыся на месцы, па-бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю прарываў.

Вечарам была заслухана справаздача раённага камітэту. У процівагу выключнай актыўнасьці зьезду, якая выявілася ў спрэчках па дакладу тав. Галадзеда, які адзначаўся высокім палітычным і правільным разуменьнем генэральнай лініі партыі,—даклад РВК быў глыбока дзяляцкім. Даклядчык—старшыня РВК т. Вінаградаў — умудрыўся абыйсьці моўчкі кардынальнейшыя пытаньні партыйнай палітыкі, пытаньні клясавай барацьбы ў раёне, пытаньні канцентрацыі, нацыянальнай палітыкі, барацьбы партыі на два фронты.

Лінія партыі і саветаў—адна і тая-ж лінія. Такая ўстаноўка нашай партыі. Дакладчык не разумее гэтага, ці ня хоча разумець і ні аднаго слова аб ролі сельсаветаў у галіне калгаснага будаўніцтва ў дакладзе ня было.

Між тым, ідэн на правыя практыка разу сельсаветаў, засьмечаных у мінулым клясава-чужымі нам элементамі, давала паблажкі кулаку, баючыся яго—асноўны торназ, які перашкаджае калгаснаму прыліву.

У раёне дзе моцная антыкалгасная агітацыя кулака, ідзе жорсткая клясавая барацьба вакол калгасаў. Гэта выявілася ў часе перавыбараў праўленьняў калгасаў. Між тым ненатарыя сельсаветы стаяць і зараз у баку ад гэтай клясавай барацьбы.

У боязьні перад «левымі» загібамі нават РВК ослабіў націск на кулака, чым узмацніў яго пазыцыі. Перавыбары сельсаветаў таксама ' супраждаваліся клясавай барацьбой. Даклядчык ня даў аналізу гэтая барацьбы і не намеціў канкрэтных задач саветаў на будучы час.

Пытаньне загатовак—бавное пытаньне; ёсьць невыкананьне на ўсіх культурах. Між тым, даклядчык па гэтым пытаньні лічыў патрэбным абмежавацца нарай недарэчных анэкдотаў.

Агульнае ўражаньне—даклад яўна дзяляцкі, з яго выпусканы ўсякі палітычны зьмест, абойдзены кардынальныя пытаньні партыйнай палітыкі. Даклад не мабілізуе мас і зьезду на барацьбу з прарывамі, на барацьбу за выкананьне ўдарнымі тэмпамі балых задач трэцяга году пяцігодкі.

Сесьня пачалася спрэчкі па справаздачы райвыканкому. Зьезд правільна ацаніў апартуністычную ўстаноўку ў справаздачы РВК. Дэлегаты далі розгі адпор правым апартуністам і жорстка крытыкавалі работу і даклад РВК. Спрэчкі працягваюцца.

ГРАХНЕЎ.

„Зараз мы дужа заняты“

БРАГІНА. Райкалгасасюз марудзіць з укамплектаваньнем спэцыялізаваных сьвінагадоўчых калгасаў сьвінаматкамі. Некаторыя калгасы, як калгас імя Варашылава, павінны былі мець па 200 сьвінаматак, а ёсьць — па 20-30.

Вэтэрынар штодзенна наведвае старшыню райкалгасасюзу тав. Дрэйчука з просьбай накіраваць адабраную жывёлу для ўкамплектаваньня стада калгасаў, але ён усё адказвае: «зараз мы дужа заняты, гэту справу вырашым праз 5-8 дзён». Адабраная-ж жывёла стаіць тыднямі без належнага догляду, пасьля чаго ідзе на ўбой.

Гэтыя агідныя факты ў справе ўкамплектаваньня сьвінагадоўчых гаспадарак жывёлай павінны быць вынішчаны.

МОЛАТ.

Віцебскія камсамольцы змагаюцца

за вырашэньне мясной праблемы

ДЗІКІЯ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ—НА АДКОРМ СЬВІНЕЙ

ВІЦЕБСК. Камсамольцы Віцебску прынялі актыўны ўдзел у правядзеньні ўсебеларускай сьвінагадоўчай эстафэты. Штаб, створаны гаркомам ЛКСМБ пры камсамольскім калектыве Белвэтінстытуту, правёў цікавую работу па выяўленьні ўнутраных кармавых рэсурсаў з мэтай выкарыстаньня іх для адкорму сьвіней. 45 камсамольцаў абсьледавалі 29 сталовых ЦРК, 5 хлебапякарань, 3 млыны і прыхарэмны сьвінагадоўчы саўгас ЦРК. Абсьледаваньнем устаноўлена, што па Віцебску ад грамадзкага харчаваньня кожны дзень застаецца 42» кар. капусных кажалкаў, хлеба і хлебных окарынак, 229 вёдзер адкідаў першага гатунку (капуста, гарох, бульба, каша), 2.183 кгр. бульбяных адкідаў і 100 кгр. мучных нотрубей.

Большая частка ўсіх адкідаў перадаецца за плату ці дармова прыватным асобам. Ёсьць нават выпадкі, калі прыватніку даплочваюцца грошы за тое, што ён забірае гэтыя адкіды (акт брыгады стаўоўкі № 8).

На самых мінімальных падліках выкарыстаньне адкідаў дапо-б магчымасьць адкармліваць па Віцебску каля 700 сьвіней.

Трэба ліквідаваць па горадзе дробныя адкормачныя пункты, набудаваўшы каля гораду адну або дзве буйныя адкормачныя базы, выкарыстаўшы для гэтай мэты ў першую чаргу прыгарадны сьвінагадоўчы саўгас «Вільлева-Сакольнікі», дзе набудаван нядаўна сьвінарнік на 2.000 штук, які пашыраецца на 1.000 штук.

ЦРК трэба ва ўдарным парадку арганізаваць абор і захаваньне адкідаў па сталоўках, хлебапякарнях і млынох, а таксама транспартаваньне іх на адкормачную базу. Павінны быць вылучаны камсамольцы з калектыву ЦРК, як адказныя асобы за якасьць паступаючых з сталовых адкідаў, і ўжыта прэміяваньне служачых сталовых за лепшы якасны абор харчовых адкідаў.

Старынскі, Кавалёўскі.

Сьвінаадкормачныя „апэрацыі“ райпаляводсаюзу

КАПАТКЕВІЧЫ. На сьвіна-адкормачным пункце Капаткевіцкага райпаляводсаюзу ёсьць каля 100 сьвіней. Адкорм і паогул утрыманьне сьвіней паставлена дрэнна. Сьвінарнік зусім непагодны для адкорму. Ёсьць выпадкі, калі маладняку не даецца корм на працягу некалькіх дзён. Процант ураджаю сьвіней вялікі. РСІ павінна зацікавіцца сьвіна-адкормачнымі апэрацыямі Капаткевіцкага райпаляводсаюзу. Всхз.

Кантрактацыю —у цэнтр увагі жывёлагадоўчай кааперацыі

Вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі патрабуе ад сыстэмы жывёлагадоўчай кааперацыі БССР, на якую ўскладзены канкрэтныя абавязкі па непасрэдным правядзеньні гэтага важнейшага мерапрыемства, безадкладнага пераключэньня ўсёй работы на бальшавіцкія тэмпы.

Кантрактацыя — адзін з магутнейшых фактараў пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны і арганізацыі новай хвалі калгаснага прыліву і вытворчага каапераваньня бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Сыстэма павінна разам з мясцовымі арганізацыямі разгарнуць вакол кантрактацыі масавую арганізацыйную і растлумачальную работу, прапрацаваць адозвы аб кантрактацыі на групах беднаты, сходах вясковага актыву, калгасьнікаў, першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў.

Трэба мабілізаваць увагу асноўных мас сялянства на практычную рэалізацыю адозвы партыі і ўраду, даючы рупнуючы ўдар па кулаку і яго агентуры—правых і «левых» апартуністаў, якія зрываюць сацыялістычную рэканструкцыю вёскі.

Сыстэма жывёлагадоўчай кааперацыі павінна зьвязацца з райкомамі і ячэйкамі камсамолу і вылучыць ударныя брыгады для дапамогі ў правядзеньні кантрактацыі, шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж райкамсаюзамі, калгасамі, першапачатковымі вытворчымі аб'яднаньнямі і вёскамі, аказваючы ў гэтай справе дапамогу адпаведным арганізацыям і вёскам.

Да гэтага часу жывёлагадоўчая кааперацыя, асабліва першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні займаліся амаль выключна жывёлагадоўляй. У сучасны момант на сыстэму ўскладзены абавязкі па абслугоўваньні і паляводзтва.

Трэба як можна хутчэй давесьці пасоўныя планы да першапачатковых аб'яднаньняў і насельніц, прыступіць да ачысткі збожжа і ўстанавіць у першапачатковых вытворчых таварыствах пункты на ачысткі збожжа. Трэба палаадзіць кантроль над работай гэтых пунктаў з тым, каб машыны працавалі з поўнай нагрузкай. Ва ўсёй рабоце на сортаабменных апэрацыях, стварэньні насенных фондаў, загатоўках насеньня павінен быць узят такі тэмп, які забясьпечыў-бы ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянаў.

У правядзеньні веснавой сяўбы важную ролю адыгрывае вапнаваньне глебы. Сыстэма павінна прыняць рашучыя меры па выкарыстаньні саннай дарогі для вывазкі з мляўной вапны. Адначасова трэба прыняць меры да хутчэйшай рэалізацыі штучных угнаеньняў і сельска-гаспадарчых машын.

Задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам перад сыстэмай жывёлагадоўчай кааперацыі, павінны быць выкананы па-баявому, па-бальшавіцку. Для гэтага патрэбна мабілізацыя ўсяго апарату сыстэмы зьверху данізу, шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не дапушчаючы стаўкі на самацёк і змагаючыся з правымі правага і «левага» апартунізму.

Журэмскі.

Аб „рабочай сіле“ і сьметанковым масьле

(З блек-ноту разьязнога карэспандэнта)

Барацьба за повы калгасны прыліў пастракае шмат перашкод на сваім шляху. Але гэтыя перашкоды можна перамагчы. Можна сьцьвярджаць, што ў любым раёне нашай Беларусі ёсьць усё неабходнае, каб зьнішчыць і сьмела расчысьціць шлях мільёнам сялянскіх гаспадарак на выведаны і праверены на тысячы ладоў шлях калгасаў.

Для гэтага патрэбна толькі адна, абавязковая ўмова — непахісная вера ў правільнасьць ленінскіх прынцыпаў, гаротнасьць усімі сіламі і сродкамі змагацца за чыстату ленінскіх лёзунгаў, за генэральную лінію партыі, намечаную Леніным, ня спыняючыся ні перад чым.

Што тармозіць прыліў?

Перш за ўсё самацёчныя настроі, «праклаленьне перад стыхійнасьцю руху» і адмаўленьне на гэтай падставе ад арганізуючай ролі партыі ў калгасным будаўніцтве, поўнае спыненьне масавай арганізатарска-прапагандысцкай работы за новага калгасьніка. Па сутнасьці гэта азначае — аддаць вёску ва ўладу кулацкага агітпропа, які часамі куды з большымі посьпехамі, чым мы, вядзе сваю шкодніцкую супроцькалгасную агітацыю.

На Старадароскім зьезьдзе саветаў адна з дэлегатак у сваім выступленьні сказала:

— Мы забылі, што такое калектывізацыя. Мы чулі аб гэтым у мінулым годзе. Як зараз ставяцца пытаньні аб калгасах? Кулак гаворыць, што калгасы выгодны для бедняка, а серадняку ад іх зараз, ён гаворыць, што можна арганізоўваць нейкія пасялковыя таварыствы, куды можна ўступаць усёй вёскай, разам з кулакамі. Мы ня ведаем, гэта праўда, ці не. Жаночых сходаў у нашым сельсавеце ня было з мінулае вімы. Нашы бабы адукуюцца па калгасных пытаньнях за студняў, ды на вячорках. Работнікаў з раёну мы ня бачылі за год ні разу.

Гэта дэлегатка з далёкага раёну. Іншыя дэлегаты пацьвердзілі, што некаторыя сельсаветы не адважваюцца чапаць кулака, цьвёрдых заданьняў ім не далі (...) і толькі праз 2 месяцы пасьля тэрміну, каб амаваць правую практыку адпаасобным адміністрацыйным распараджэньнем старшыні сельсавету, бяз услкага абгаварэньня пытаньня з беднатой і актывам, былі даны сьмехатворныя заданьні ў... 10 пуд. На бядняцкія-ж гаспадаркі было накладзена... 50 пудоў (Пасекі сельсавет).

Дэлегатка гэта ў заключэньні сказала:

— Вы мяне выбачайце за гэтыя горкія словы, але пан савет трэба падпружбаваць, бо ён пакоіт калгаснае лініі ня цьвёрда стаіць.

Зьезд шумна апладаваў гэтаму выступленьню. Але тут вопраскі ня к месцу. Чаму тут аплёдаваць, калі, напрыклад, Жытынінскі сельсавет ні разу на працягу году не пацінавіўся работай калгасу, не паставіў і не абмеркаваў яго дакладаў. І як вынік — процант калектывізацыі ў раёне — каля 10. Мала Тэмпы старадароскія ганебны, небальшавіцкія. Правая практыка, стаўка на самацёк, патураньне кулаку — вось што акрэсьлівае работу ў Старых Дарогах.

Два прыклады ілюструюць нашы вывады.

Вёска Шабшычы. 120 двароў. Малазямельле — надзел 3-4 гэкт., максымум каля 7-8 гэкт. Хлеб ужо з паловы зімы большасьць купляе. Беднота ў вёсцы пераважае. Кулакі стаіліся. Але ў калгас бядняцка-серадняцкія масы ня ідуць. У чым справа?

Тлумачыцца вельмі проста. Ніякай работы за прыліў не вядзецца, антыкалгаснай агітацыі, якая ўмела вакіроўваецца моцнай рукой прытоенага кулака, не процідзеўстаўлена выразная партыйная лінія. Вёска пад бокам у раённых арганізацый. За 4-5 клм. ад раённага цэнтру. Але раённыкі ні разу не наведалі вёску на працягу году.

На чым грае кулак?

Мне прышлося сумесна з старшынёю СНК БССР — тав. Галадзедам быць на сходзе ў гэтай вёсцы. Кулак прапаведуе клясавы мір у вёсцы. «Мы ўсе беднякі, нам уласнага хлеба не хапае з калядзі, дасьпе нам прамтавары і забясьпечыце зараз-за ўсім неабходным, у калгас пойдзем». Беднота, якоб ніхто не накіроўвае і ня кіруе, утурце кулаку. Кулак прыкрывае сябе, а беднота не разумее гэтага.

Іма Леніна—сьвятое для мас. Гэта кулак вельмі добра разумее. І ў сваёй антыкалгаснай падрыўной агітацыі прыкрываецца імем Леніна.

Кулак «навучае»:

— Ленін вучыў роўнасьці, ён казаў, што ўсе роўныя, а вы пацкоўваеце аднаго мужыка на другога. Надзялілі вёску на батракоў, беднякоў, сераднякоў і кулакоў. Якія кулакі і якія беднякі? Мы ўсе роўныя. У калгасы клічаце, каб і там нас падзяліць.

Гэта агітацыя разьлічана на серадняка і моцна трымае яго.

Што змаглі раённыя арганізацыі і сельсавет процідзеўстаўць гэтай дэзарганізатарскай рабоце ворагаў калгаснага будаўніцтва ў Старых Дарогах? Нічога. Вёскай верхаводзяць два браты Жукаўцы Яўхім і Захар. У недалёкім мінулым яны мелі звыш 15 гэкт. зямлі, 4-5 коняй, 8 кароў. Яны ў час прадугледзелі і падзялілі сваю гаспадарку па дзьве часткі. Зараз лічацца «сераднякамі», але кулацкае сваё нутро захавалі і моцна трымаюць у сваіх руках беднату і серадняка.

Беднаты на сходах няма. Ня ў сэнсе фізычнай прысутнасьці — яна ўся тут, а беднаты, як кіруючай арганізатарскай групы, якая задае тон вёсцы. Асобныя бязьзлівыя і плюпэўненыя выступленьні беднаты тэрарызуюцца крыкунамі і дэмагогамі. І толькі ў канцы васьмігадзіннага сходу, калі тав. Галадзед назваў рэчы сваімі імёнамі, выгрыў мануўры падкулачнікаў, беднота, сустрэўшы падтрыманьне, вышла і сьмела заявіла:

— Мы за калгасы, мы ўсёй душой за калгас.

На сходзе 15 гаспадарак падалі заявы ў калгас. За імі пойдуць і іншыя. Гэта бясспрэчна. Клясавы мір у Шабшычах парушан. Беднота ўзяла лейцы ў рукі. І нічога-ж асаблівага ня здарылася. Проста тав. Галадзед ясную і зразумелую моваю, даступнаю разуменьню селяніна, растлумачыў лінію партыі, расказаў, куды гнуць Жукаўцы і ім падобныя. Тое, што зрабіў тав. Галадзед за адзін сход, раённыкі і сельсавет абавязаны рабіць кожны дзень, кожную гадзіну. Кулак моцны толькі тады, калі бяцца яго і не ведуць рашучага і бязьлітаснага наступленьня на яго.

Вёска да калектывізацыі гатова. Гэта бясспрэчна. «Шлях калгасаў ня ёсьць шлях ужо нявыведаны і неправераны. Ён выведаны і праверены на тысячу ладоў самімі сялянскімі масамі. Выведан і ацэнен, як новае, даючае сялянам вызваленьне ад кулацкай кабалы, ад галечы і цемры» (Сталін).

Лінія партыі перамагае і ніякія супраціўленьні клясавага ворага ня зломяць імкненьня ў калгасы, бо сёньня, ня толькі на вёсцы, як такавой, ідзе барацьба старога з новым, але і ў кожнай сялянскай сям'і. На сходзе ў в. Новыя Дарогі сын і дачка выкрылі перад усім сходам падкулачніцу матку Тацьцяну Міхалькевіч, купленую кулаком, адмовіліся ад яе і пайшлі ў калгас. І партыйныя арганізацыі і саветы абавязаны стаць на чале гэтай барацьбы.

Адмаўленьне ад масавай штодзённай арганізатарскай прапагандысцкай работы партыйных арганізацый і саветаў, наперакор ясным указаньням партыі зьяўляецца самай шкодная правая правага апартунізму на практыцы. Партыя падкрэсьліла добраахвотнасьць калгаснага руху, але гэта ні ў якай меры ня значыць, што яна адмовіцца ад арганізуючай ролі ў калгасным будаўніцтве і ўступіць поле кулацкаму агітпропу.

* * *

Існуючыя старыя калгасы павінны быць арганізатарамі новага калгаснага прыліву. Буксірныя і вярбовачныя брыгады калгасьнікаў, шырокія справаздачы перад аднаасобнікамі аб выніках першага году калектыўнага гаспадараньня — асноўныя і праверэныя на практыцы формы барацьбы за прыліў. Яны бліскуча праводзяцца на Паўночным Каўказе, Украіне, Сярэдняй і Ніжняй Волзе.

У Ст. Дарогах і Асіповічах калгасы яшчэ ня сталі арганізатарамі барацьбы за прыліў. Некаторыя калгасы замкнуліся ў асабістай шкарлупцы, у іх моцны спажывецкія настроі, ганебна арганізавана праца, мае месца безгаспадарчасьць, якая адштурхвае серадняка ад калгасаў.

Нацыянальны яўрэйскі калгас «Прагрэс» у Асіповіцкім раёне існуе звыш году. Напрамак — малочна-жывёлагадоўчы. У калгасе ёсьць звыш 70 штук жывёлы (з маладняком), 10 коняй. У калгасе 29 працаздольных членаў. Калгас за адзін год гаспадараньня змог атрымаць 16 тыс. руб. крэдыту. Але першымі словамі, з якімі зьвярнуліся калгасьнікі да тав. Галадзеда, былі скаргі: таго няма, другога не даюць, хадзіць няма ў чым, каапэрацыя не, забясьпечвае. Суседні леспрамгас мае патрэбу ў рабочай сіле і ўжываным транспарце для вывазкі лесу. Апрача платы, якая даходзіць да 5-6 руб. у дзень, саўгас забясьпечвае і фуражом, у дадатак да гэтага яшчэ прэміяе прамтаварамі. У «Прагрэсе» ёсьць і вольныя людзі і вольныя коні. Але ні адзін калгасьнік не паехаў на работу. Калгас за гэта лета аплочваў дасканалыя дамы для жыльля, але абора для 70 кароў толькі пядаўна скончана, пакрыта саломай і пабудована часова па звычайным сялянскім тыпс. Мы не дабіліся дакладных даведак, на якія мэты адпушчаны вялікія крэдыты калгасу, але ёсьць падставы меркаваць, што ён (калгас) патраціў сумы, якія адпушчаны на пабудову тыповых двароў для скаціны, на жыльлёвае будаўніцтва, а якім-бы яшчэ можна было пачакаць. Калгас і зараз робіць спробу атрымаць новыя крэдыты, у тым ліку і на пабудову жыльлёвых будынкаў. Настроі ў калгасе яўна-ўтрымаўчыя. Стараецца ўражаньне, быццам, яны зрабілі дзяржаве ласку, што пайшлі ў калгас і вось зараз нездаволены, што іх кепска забясьпечваюць.

Яркім кантрастам у параўнаньні з гэтым яўна-ўтрымаўчым калгасам зьяўляецца калгас «Інтэрнацыянал», за 5 кілёмэтраў адсюль, на тэрыторыі таго-ж сельсавету.

Гаспадарчыя паказальнікі ў абодвух калгасах амаль аднолькавыя. Але калгас «Інтэрнацыянал» не атрымаў ні капейкі крэдытаў за мінулы год. У калгасе 12 гаспадарак. Ураджай збожжавых культур быў у гэтым годзе выключна кепскі.

Тым ня менш заданьне па загатоўках выканана цалкам. Апрача таго калгас здаў дзяржаве вагон бульбы, 280 пуд. капусты, вагон буракоў, 60 пуд. гуркоў.

Не патрабуючы ад дзяржавы крэдытаў, калгас сам выкарыстоўвае ўсе магчымасьці, каб рацыянальна за зіму выкарыстаць усе вольныя рабочыя рукі. 8 калгасьнікаў з коньмі кожны дзень выяжджаюць на лесавывазку. Гэта дае ў дзень 40-50 руб. і фураж на цьвёрдых цанах.

На працягу зімы калгас мяркуе зарабіць на лесавывазках ня менш 5.000 руб. Каб стымуляваць выезд на работу на лесавывазках калгасьнікі зарганізавалі спаборніцтва. Жаданьне ехаць на лесавывазні ёсьць ва ўсіх. Але-ж патрэбна каму-небудзь заставацца і ў калгасе для ўнутраных работ па догляде жывёлы. Калгасьнікі ўстанавілі чарговасьць выезду. Каб ня было крыўды таму, які прымацаваны да ўнутранай работы, уведзена прэміяваньне яго за кошт выяжджаючага на лесараспрацёўкі, апрача таго, два калгасьнікі ня едуць у той дзень на лесавывазні, прымяжць на сябе, разам з пастаянным работнікам, усе клопаты па догляде коняй. Як толькі калгасьнікі вернуцца з лесу, яны здаюць сваіх коняй тым, якія ня езьдзілі, а тыя поль і нормаць іх, зранку запрагуць у сані, разбудзяць чарговых, каму ехаць у лес: садзіся, прыяцель і едзь.

Вось як трэба арганізаваць працу ў калгасе.

Калі арганізаваўся гэты калгас, кулакі агітавалі: сабраліся лодыры, злыдні, працавітаму і стараннаму мужыку в імі ісьці нельга. Яны прядуць усю сваю маемасьць і на гарэлцы прапіюць. Год калектыўнага гаспадараньня выкрыў кулацкую брахню. І сёньня кулак такцыку зьмяніў. «Што да вас ісьці ў калгас, ды вы-ж працуеце, як катаржныя, з ночы дзень робіце, мы ня бачым, калі вы сьпіце». Такцыка кулака зьмяняецца адпаведна абставінам.

Кулак і тут усімі мерамі трымае бедняка, а савет і раённыя арганізацыі і тут не на вышыні. Кулакі ня толькі агітуюць, яны проста шкодзяць калгасу. Кулак Налівайка ў разгар уборачнай кампаніі напсаваў калгасную касілку і ўнёс дэзарганізацыю ў работу калгасу. Налівайка павінен быць асуджан за шкодніцтва, але Асіповіцкі суд прыгаварыў яго на ½ года, падвёўшы пад амністыю. г. зн. апраўдаў.

* * *

У Стара-Дароскім раёне ёсьць калгас імя 10-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Калгас інтэрнацыянальны. Арганізаваўся на базе былой памешчыцкай гаспадаркі, м

Паскорыць тэмпы падрыхтоўкі

Пастанова калегіі НК РСІ БССР ад 30 студзеня 1931 г.

па пытаньні аб падрыхтаванасьці будаўнічых арганізацый БССР да будаўніцтва 1931 году

А

Тэмп і разьмеры падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону не адпавядаюць тэмпам будаўніцтва трэцяга году пяцігодкі і ў параўнаньні з мінулым годам ёсьць пагоршэньне. Праекты і чарцяжы на новае будаўніцтва не атрыманы, тытульных сьпісаў у большасьці выпадкаў таксама няма, адсутнічаюць у некаторай частцы арганізацый праекты і тытульныя сьпісы на летаншняе будаўніцтва, заяўкі на будаўнічыя матар'ялы і рабочую сілу не даны (за выключэньнем ВСНГ БССР), вывазка матар'ялаў праводзіцца толькі ў некаторых мясцох, работадаўцы не забясьпечылі патрэбнай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону. Да гэтага часу засталіся нявырашанымі такія пытаньні, як транспартаваньне, фінансаваньне, фонды дэфіцытных матар'ялаў, пытаньне з нарудным выкананьнем. Усё гэтае стварыла напружанае становішча ў будаўнічых арганізацыях і прывяло да страты часу на падрыхтоўку да будаўніцтва 1931 году.

Б

Будаўнічыя арганізацыі не пераключыліся поўнасьцю на плянавыя мэтады работы. Аб'екты не ахоплены поўнасьцю сыстэмай дагавароў, яны складаюцца без назначанасьці напярэдніх каштарысаў і праектаў. Праекты паступаюць з вялікім спазьненьнем і ў парадку, які не адпавядае ўмовам будаўніцтва і прадпрыемства; у паступаючых праектах ня ўлічваюцца мясцовыя ўмовы, а малы і слабы склад тэхнэрсаналу на мясцох не заўсёды ў стане пераапрацоўваць іх. Мясцовыя арганізацыі ня ведаюць, дзе і як павінны зацьвярджацца праекты.

В

Фінансавае становішча будаўнічых арганізацый, з прычыны ўкладаньня сродкаў у няплянавае будаўніцтва, несвачасовага разьліку з работадаўцамі і адсутнасьці зваротных сродкаў, — напружанае.

Г

Адзначаючы зрух у галіне ўжываньня мэханізмаў на будаўніцтве, асабліва па Белдзяржбудзе, а таксама і выпрацоўку стандартных частак на прадпрыемствах, калегія канстатуе, што назначаныя мэханізмы не забясьпечваюць правільнай і поўнай мэханізацыі працэсаў будаўніцтва, што значэ больш паглыбленна направільным скарыстаньнем іх, адсутнасьцю ўліку і вывучэньня іх работы. Апрача таго ня ўсімі бударганізацыямі даны заяўкі на патрэбную колькасьць будаўнічых мэханізмаў на 1931 год. Пытаньне аб ужываньні новых будаўнічых матар'ялаў бударганізацыямі не распрацавана і ў адносінах ужываньня іх назіраецца капсэрватызм.

Д

Зьніжэньню сабекошту будаўніцтва бударганізацыі не аддалі належнай увагі. Дырэктывы ўраду і партыі аб зьніжэньні сабекошту ня выкананы. Улику кошту выдаткаваньня матар'ялаў і рабсілы па асобных элемэнтах будаўніцтва няма, ня гледзячы на рад дырэктыў ураду ў гэтых адносінах (за выключэньнем некаторых аб'ектаў па Белдзяржбудзе, пачатых пабудовай у канцы 1930 г.).

Улічваючы ўсё вышэйпаданае, калегія НК-РСІ БССР пастанаўляе:

1

Прапанаваць усім цэнтральным будаўнічым арганізацыям, трэстам і аб'яднаньням (работадаўцам) у 3-хдзённы тэрмін разаслаць на месцы зацьверджаныя кантрольныя лічбы, заданьні і тытульныя сьпісы, а таксама прыступіць да тэрміновага складаньня генэральных плянаў.

2

У мэтах лепшага плянаваньня і свачасовага правядзеньня будаўніцтва прапанаваць усім бударганізацыям заключаць дагавары на ўсе пабудовы. Да правядзеньня будаўніцтва прыступіць толькі пры наяўнасьці праектаў. Лічыць безгаспадарчасьцю і безадказнымі адносінамі да сродкаў пралетарскай краіны, калі якое-небудзь будаўніцтва вядзецца без дакладнага каштарысу. Праектуючым арганізацыям пасторыць і ўзмацніць тэмп прахаджэньня і складаньня праектаў, дапасоўваючы іх да мясцовых умоў, рыхтуючы ў першую чаргу праекты асноўных аб'ектаў будаўніцтва. Абавязаць работадаўцаў свачасова давацьтэхнічна і эканамічна ўгрунтаваныя заданьні на праектаваньне. Дзяржпляну даць сваім арганізацыям па месцы неабходныя паказаньні пра парадак прахаджэньня і зацьвярджэньня праектаў на грунце пастановы СНК БССР.

3

Прапанаваць будаўнічым арганізацыям і работадаўцам не пазьней 15 лютага 1931 г. скласьці дагавары на ўсе аб'екты будаўніцтва, у якіх суму кошту будаўніцтва паказаць на грунце папярэдняга каштарысу або кубатуры будынку, а тэрмін — на грунце плану.

4

Для свачасовай і поўнай перавозкі будаўнічых матар'ялаў, а таксама пазбаўленьня будаўніцтва ад залежнасьці ад прыватніка — лічыць патрэбным узмацненьне самастойнага транспарту пры ўсіх будаўнічых канторах, прапанаваўшы Наркамснабу забясьпечыць свачасовае і нармальнае задаваленьне гэтага транспарту фуражом.

Побач з гэтым прапанаваць Калгасцэнтру, Белсельтрэсту і Белсельбуду ўжыць меры да выкарыстаньня транспарту саўгасаў і калгасаў, наводле дырэктыў ураду.

5

Прапанаваць работадаўцам у 5-дзённы тэрмін скласьці плян патрэб у будаўнічых матар'ялаў на 1931 год, падаўшы адпаведным арганізацыям заяўкі на іх.

Дзяржпляну тэрмінова высьветліць кантынгент адпушчаных Беларусі будаўнічых матар'ялаў і на працягу дэкады, на грунце атрыманых плянаў і заявак, размеркаваць іх сярод спажыўноў, прасачыўшы за выкананьнем сваіх нарадаў, аддаючы пад суд тых, хто ня выконвае нарадаў.

Абавязаць Белдзяржснаб пасьля ствараньня фондаў забясьпечыць рэалізацыю іх, ужыўшы для гэтага неабходныя меры. У мэтах лепшага скарыстаньня матар'ялаў дазволіць будаўнічым арганізацыям рабіць перакідку і манэўраваньне іх пры наяўнасьці лішкаў на іншых пабудовах, а таксама пры часовай кансэрвацыі пабудоў.

Дзяржпляну і ВОРС'у выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па дапасаваньні новых будаўнічых матар'ялаў на будаўніцтве з разьлікам магчымасьці ўжываньня іх у будаўніцтве 1931 г.

Прапанаваць горнаму аддзелу і інстытуту прамысловасьці ВСНГ прыступіць да арганізацыі і правядзеньня вышуку новых будаўнічых матар'ялаў у Беларусі, паставіўшы перад СНК БССР пытаньне аб водпуску сродкаў на гэтую справу.

6

Абавязаць будаўнічыя арганізацыі паставіць дакладны ўлік работы мэханізмаў на пабудове, ужыўшы меры да правільнага і поўнага выкарыстаньня іх, а таксама ўзмацненьня мэханізацыі ў будаўніцтве.

7

З мэтай свачасовага і поўнага забясьпячэньня будаўніцтва прапоўнай сілай і вынішчэньня ажылтвае на рынку працы прапанаваць будаўнічым арганізацыям у 3-дзённы тэрмін даць заяўкі на рабсілу, а Наркампрацы на працягу дэкады скласьці плян забясьпячэньня будаўніцтва рабсілай, сканцэнтраваўшы вярбоўку і насылку рабочай сілы выключна праз органы працы.

Забараніць будаўнічым арганізацыям займацца выдачай і размеркаваньнем прамысловых тавараў за выключэньнем спэцпопраткі. Справу разьмеркаваньня прамтавараў перадаць поўнасьцю капэрацыі і рабочым арганізацыям.

8

Пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы па выкананьні і правядзеньні ў жыцьцё пляцаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі ня могуць быць выкананы без актыўнага ўдзелу мас, а таму парт'ячэйкам, рабкомам і адміністрацыі пабудоў узмацніць работу па арганізацыі і правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва як сярод рабочых, так і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу.

Плян работы будаўнічай арганізацыі прапрацаваць на сходах рабочых, даўшы яго да брыгад.

9

Адзначаючы невыкананьне дырэктыў ураду на зьніжэньні кошту будаўніцтва і адсутнасьць належнага ўліку, прапанаваць будаўнічым арганізацыям прывесьці ў належны выгляд улік кошту будаўніцтва па асобных элемэнтах яго, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правільную пастаноўку ўліку выдаткаваньня матар'ялаў і рабсілы па асобных элемэнтах, мабілізаваўшы вакол гэтага ўвагу рабочых і тэхнічнага персаналу.

10

У мэтах лепшай эксплёатацыі кар'ераў г. Менску і свачасовага забясьпячэньня будаўніцтва гравіем, пяском і глінаю, распрацоўку і эксплёатацыю іх перадаць Белдзяржбуду, абавязаўшы яго забясьпечыць усе пабудовы г. Менску.

Прапанаваць Дзяржпляну ў тэрміновым парадку высьветліць пытаньне аб загатоўцы каменьняў.

11

Даручыць ВСНГБ абавязаць кіраўніцтва пабудовы гуты ў Касьцюкоўцы пабудаваць зьніжальную падстанцыю на тэрыторыі гэтай гуты, вызваліўшы ад гэтага гомельскую кантору Белдзяржбуду.

12

Абавязаць Будаб'яднаньне ВСНГБ забясьпечыць сваімі будаўнічымі дварамі будаўніцтва Сельбуду і іншых арганізацый стандартнымі часткамі, забараніўшы іншым будаўнічым арганізацыям арганізацыю будаўнічых двароў і майстэрань па выпрацоўцы стандартных частак будаўніцтва.

Прапанаваць ВСНГБ у 2-хдзённы тэрмін унесці ў ЭКАНА праект арганізацыі вытворчасьці па выпрацоўцы стандартных частак з тэхнікай аб канцэнтрацыі сіл і абсталяваньня на гэту мэту грашовых сродкаў і абсталяваньня.

13

У мэтах лепшай пастаноўкі праектаваньня лічыць няматэзгодным арганізацыю самастойных праектных бюро па гарадох, сканцэнтраваўшы ўсю гэту справу ў цэнтральных праектных бюро, прапанаваўшы апошнім забясьпечыць поўнае і свачасовае складаньне праектаў.

14

Улічваючы, што будаўніцтва на сяле ў асноўным праводзіцца па тыповых праектах і стандартах і што гэта будаўніцтва павінен праводзіць Белсельбуд, лічыць няматэзгодным стварэньне ў рэгіёнах самастойных будаўнічых арганізацый.

15

Улічваючы, што Белсельбуд да гэтага часу абслугоўваў усе пабудовы БССР сьвідраваньнем і вытворствам артэзіянскіх калодзежаў, прапанаваць Белсельбуду ўжыць меры і забясьпечыць выкананьне заказаў па сьвідраваньні для ўсіх пабудоў БССР.

Абавязаць ВСНГ, Дзяржплян і Белсельбуд прапрацаваць пытаньне аб арганізацыі пастаноўкі справы ў такім разьмеры, каб задаволіць заяўкі ўсіх арганізацый на сьвідраваньні калодзежаў.

16

Улічваючы, што ў Менску існуюць роўнаслежныя будаўнічыя арганізацыі, лічыць неабходным зьяліць Гандальпрамбуду з Белдзяржбудам і Менбуду з Жыльбудам з перадачай функцый Гандальпрамбуду Белдзяржбуду і Менбуду — Белжыльбуду.

Правядзеньне гэтага даручыць Дзяржпляну з афармленьнем усёй перадачы на працягу аднаго месяца. Перадачу правесьці на грунце існуючых законаў.

17

Улічваючы, што ў будаўнічых арганізацыях занята значная колькасьць інжынэрна-тэхнічных сіл — транспартнікаў і што адыход іх ня можа быць забясьпечаны замепай, прапанаваць Наркампрацы да пасылкі іх на транспарт вывучыць пытаньне аб магчымасьці замены іх, падаўшы аб гэтым у дэкадны тэрмін даклад у ЭКАНА.

18

Буйное будаўніцтва, што праводзіцца гаспадарчым чынам, прыводзіць да падаражаньня будаўніцтва, таму прапанаваць усім арганізацыям работы па пабудове новых аб'ектаў і буйных рамонтаў правесьці праз будаўнічыя арганізацыі.

19

Улічваючы, што дапасаваньне тыповых праектаў і стандартаў прыводзіць да патаньня будаўніцтва і вызваляе тэхнэрсанал ад лішняй работы на праектаваньні, абавязаць усе будаўнічыя арганізацыі шырока выкарыстоўваць існуючыя тыповыя праекты і стандарты.

20

Даклад аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1931 году ўнесьці ў ЭКАНА.

21

Даручыць інспэктару НК РСІ т. Якабсону праз месяц праверыць выкананьне гэтай пастановы ў цэнтральным апараце, гарадзкім і раённым КК-РСІ, мець увесь час нагляд за правядзеньнем гэтай пастановы ў жыцьцё, прыслаўшы да 15 сакавіка 1931 году выпіскі выкананьня.

22

Пастанову абвясьціць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б і нарком РСІ БССР **КАЛНІН.**

ДАВЫБАРЫ АКАДЭМІКАЎ ў БАН

Рэзалюцыя агульнага сходу таварыства дзяржаўнікаў-марксыстаў

Вялізарнейшыя задачы рэканструкцыйнага пэрыяду патрабуюць карэннага пералому ў рабоце нашых навуковых устаноў. Трэба, каб уся навуковая работа была поўнасьцю накіравана на выкананьне запатрабаваньняў па будаўніцтве сацыялістычнай гаспадаркі і культуры — пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Кіруючым цэнтрам, які павінен стаць рассаднікам сапраўднай марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў галіне ўсіх навук, павінна быць у БССР наша Акадэмія.

Адзначаючы гэту адказную ролю Акадэміі, таварыства падкрэсьлівае неабходнасьць больш шырокага разгортваньня ў яе дзейнасьці навукова-дасьледчай работы ў галіне тэорыі права і савецкага будаўніцтва, якое на даным этапе набывае асаблівае значэньне.

Таварыства дзяржаўнікаў-марксыстаў лічыць, што давыбары акадэмікаў БАН павінны зьявіцца зарукай канчатковай ліквідацыі рэштак контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму ў нашай навукова-дасьледчай рабоце.

Новыя акадэмікі павінны быць сапраўднымі змагарамі за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію, за сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне. Усю сваю дзейнасьць яны павінны падпарадкаваць задачам рабочай класы, якая разам з усімі працоўнымі вядзе разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі.

Таварыства выказвае ўпэўненасьць, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі абноўленая Акадэмія Навук з посьпехам выканае тыя адказныя задачы, якія ставіць перад ёй рабочая кляса БССР.

Выходзячы з вышэйпаказаных задач, што стаяць перад Беларускай Акадэміяй Навук, таварыства пазнымілівае са свайго боку наступныя кандыдатуры ў правадзейныя члены Акадэміі: т. т. ПЛАТУНА, ШЧАРБАКОВА, РЫЎЛІНА, КАНАПЛІНА, СЭРБЭНТЫ.

Урачысты вечар юбілею т. Варашылава

5-га лютага ў гарадзкім тэатры адбыўся ўрачысты вечар, прысьвечаны 50-цігадоваму юбілею т. Варашылава.

Вечар быў арганізован гарадзкім саветам Асоавіяхіму і гаркомам ЛКСМБ.

З дакладам аб дзейнасьці тав. Варашылава выступіў намесьнік старшыні ЦС Асоавіяхіму БССР т. Дылёнак.

На вечары была абвешчана пастанова ЦС Асоавіяхіму аб наданьні менскаму ціру і школе грамадзянскай авіяцыі імя Кліма Варашылава.

За актыўны ўдзел у рабоце Асоавіяхіму прэміраваны значкамі і граматамі актывістаў рабочыя т. т.: **Хаімаў** (зав. «Энэргія»), **Пліман** (гарбарня «Бальшавік»), **Хрыштафовіч** (еталонка МІРК № 9) і работніца швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» т. **Ландо.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— **Т-ва гісторыкаў-марксыстаў** просіць піжэйпамянёных т. т. зьявіцца ў інстытут гісторыі партыі ў бліжэйшы час для выпрацаваньня сваіх стэнаграм: Даўгаполава, Нікольскага, Агульніка, Ошарава, Александровіча, Альтмана, Віткоўскага, Панкевіча, Друпчыца, Даўгяла і ўсіх т. т., прымаўшых удзел у спрэчках па дакладу т. т. Матулайціса і Дудкова.

— **Дом Чырвонай арміі** (вайсковы кабінэт). 8-га лютага, у 18 гадз. адбудзецца нарада вялізатараў школ 7-годак г. Менску. Яўка вялізатараў абавязкова.

— **Дом Камасьветы імя Карла Маркса.** 8 лютага, у 7 гадз. веч.—групавая кансультацыя для завочнікаў Камунаўку, СПШ і т. т., якія займаюцца самаадукацыяй па беларускай мове і рэвалюцыйным руху.

Ад 6—10 гадз. індывід. кансульт. па партбудаўніцтве.

— **Клюб будаўнікоў.** 10-га лютага, роўна ў 7 гадз. веч., у памяшк. клюбу будаўнікоў, (вул. Энгельса, № 13) адбудзецца Менскі агульна-гарадзкі сход прафактыву будаўнікоў. У парадку дня: 1) Даклад аб выніках і пастановах апошняга пленуму УсеЦСПС. 2) Іншае. На даны сход павінны абавязкова зьявіцца ўсе члены і кандыдаты ЦП, нізавых праф'чэек, кіраўнікі сэктараў і груп, а таксама запрашаецца ўвесь добрахвотны актыў ЦП і чізавых праф'чэек і радавыя члены саюзу.

— **Т-ва пэдагогаў-марксыстаў.** 9-га студзеня ў 7½ гадзін вечара адбудзецца сход таварыства пэдагогаў-марксыстаў (Унів. гарадок, прырод. корпус, 1 паверх). У парадку дня — працяг спрэчак па дакладу тав. Шапіра. Запрашаюцца дактары і настаўнікі.

— **11 лютага адбудзецца агульны сход ўтрымацаў рабочых швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» 2 і 4 груп, у чырвоным кутку ф-кі (Ленінская № 17) у 6 гадз. вечара. Парадак дня—выбары ў гарсавет. Просьба да ўсіх утрымацаў наведаць сходы.**

— **Да ведама ўсіх хатніх работніц** мясцкому № 2. У нядзелю 8 лютага ў клюбе камунальнікаў адбудзецца агульны сход хатніх работніц. Усе наймальнікі павінны на гэты сход адпусьціць сваіх работніц на перавыбары ў гарсавет.

— Згодна пастановы прэзыдыуму Мен. Гар. КК-РСІ ад 26-га студзеня 1931 г. пры гар. КК уводзіцца дзяжурства з 15-га лютага г. г. членаў гар. КК; мэтай дзяжурства ставіцца: сувязь з пэфствуючымі арганізацыямі пад дзяржапаратам, сэкцыі гар. і с/с, «Л. К.», рабселькорамі, пралетаўнікоў вытворчымі і эканомнарадамі, дэлегатамі, актывам РСІ. Для дзяжурства вызначаны наступныя таварышы: **Кеніг, Гурэвіч, Шкірыч, Фунт, Кастрынскі, Калабееў, Андрыеўская, Шчыкала, Готліб, Фрыдман, Малашка, Юдэльсон, Ганчар, Вільнабрыскі, Гольдман, Ламэносаў, Хмялеўскі, Лійц, Барсукоў, Вішнеўская, Кундрукоў, Казлоўскі, Зянчук, Эпштэйн, Шэйман, Якімовіч, Кавалёў, Вайнэровіч, Вонсек, Цімошчанка, Плятнёў, Васільлеў, Пілешакоў, Бабулек, Прахін, Рэўтовіч, Ратнэр, Майзіт і Альтшулер.** Усім вышэйпамянёным таварышом патрэбна зьявіцца да 15 лютага 1931 г. у гар. КК (Энгельса 28, 2-гі паверх) для ўстанаўленьня даты дзяжурства, якія будуць штодзённа ад 7 да 9 увеч. за выключэньнем парт. дзён 7, 17, 27.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і канцылярыя канторы
Менск, Савецкая, 83.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дэрмовым дадатнем „Праф фронт")

На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнае тэксту—у два разы дарожэй. Кантэнгентны рахунак выдавецтва № 52/100501 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 83, 2-гі паверх тэл. 7-31.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Саюзкіно"
АМЭРЫКАНКА кіно-эпапэя ў 6 частках
Часопісь „Саюзкіно" № 75
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
ВЯЛІКАЕ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
арт. Аіаск. Мюзік-Холла.
М. І. Дарская, Эмаль Кемпэр.
2 Жэрэ 2—зусім новы рэпэртуар
новы фільм сэзону **ІГДЭНБУ**
Пач. сэансаў у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
Каса—з 5 гадз.

КІНО „ІКТЭРКА-ЦЫЯКАЛ"
З прычыны вялікага посьпеху, 2-гі тыдзень
РУБІКОН драма ў 7 частках
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
І частка фільма паводле рамана Ж. Ромэн-Гілейэма
МАБУЛ
(Крывавы патоп) драма ў 9 частках.
Штодзённа 4 сэансы. І частка 1 с. у 6 г.
Каса адкрыта з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Новы дзіцячы фільм вытворчасьці ВУФКУ
ГАЗЭТЧЫКІ
кіно-фільм у 6 частках.
Пачатак сэансу у 1 гадз. дня
Каса адчынена з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі ТЫДЗЕНЬ
Бетэн
Барацьба гігантаў
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансаў: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадзін.

МЕНСКАЯ ГАР. КК КП(б)Б-РСІ

паведамляе, што 11-II—31 г. у 6 гадзін увечары ў клюбе ХАРЧАВІКОЎ (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

СКЛІКАЕЦЦА

шырокая гарадзкая нарада завода-шэфаў і падшэфных устаноў

па пытаньні:

Аб чарговых задачах масавай працы КК-РСІ і рабочага шэфства над дзяржапаратам.

На нараду павінны зьявіцца сакратары парткалектываў, ячэек, старшыні ФЗМК, шэфствуючыя брыгады, трыкутнікі падшэфных устаноў, рабселькоры «лёгкія кавалерысты», пралетаўнікі насьцен-газэт і шматтыражак.

Таксама запрашаюцца на нараду пралетаўнікі ЦКК-НК РСІ, гаркому КП(б)Б, гаркому ЛКСМБ, ЦСПСБ, ЦП саюзаў і ўсіх рэдакцый газэт «Зьвязда», «Рабочий», «Чырвоная зьмена», «Савецкая Беларусь».

З прычыны важнасьці пытаньня неабходна свачасова ўсім вышэйазначаным т. т. паведаміць. Адказнасьць за свачасовую яўку на нараду ўскладзецца на сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б.

МЕН. ГАР. КК КП(б)Б-РСІ.

Да чысткі апарату БЕЛКАМУНБАНКУ

Камісія па чыстцы апарату Белкамунбанку просіць усе прадпрыемствы і установы і пасобных грамадзян матар'ял аб недахопах у рабоце апарату, а таксама матар'ялы на пасобных супрацоўнікаў апарату накіроўваць па адрасе: Менск, Камунбанк, камісіі па чыстцы.

Камісія прымае наведвальнікаў штодзённа ў чырвоным кутку Камунбанку.

Старшыня камісіі т. **Майзіт** прымае з 11 гадз. ран. да 1 гадз. дня.

Чл. камісіі т. **Пятровіч** прымае з 1 гадз. да 4-х гадз. дня.

„ „ т. **Гальскон** прымае з 9 гадз. ран. да 11 гадз.

Вечарамі прымае ўся камісія па чарзе з 7 гадз. веч.

9-га лютага ў 7 гадз. вечара, у памяшканьні Белкамунбанку камісіяй па чыстцы праводзіцца вечар самакрытыкі працы Банку.

Просьба да ўсіх клієнтаў Банку, рабочых і грамадзкіх арганізацый прымаць актыўны ўдзел.

Камісія па чыстцы.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
З панядзелка, 9-га лютага
вялікі гукавы фільм
13 дзён
(СПРАВА „ПРАМПАРТЫІ")

ЗДЫМКІ РАБІЛІСЯ ў дні судовага працэсу ў Маскве ў Калён. залі Дому Саюзаў з 25-XI—7-XII—1930 г.

ЗЬМЕСТ ФІЛЬМУ:
1. Суд ідзе.
2. Показаньні падсудных.
3. Слова пракурору.
4. Апошнія словы падсудных.
5. Прыгавор.

Папярэдні продаж білетаў у тэатр. раб. касе.

9-II г. г., у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ГК МОПР'у (Савецкая, 87)

АДБУДЗЕЦЦА

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ГК МОПР'у

з наступным парадкам дня:

1) Аб уделе МОПР'у ў весьнавой пасэўнай кампаніі. 2) Папярэдняя выніні ходу КЗД. 3) Аб МОПР-эстафеце. 4) Бягучыя справы. З прычыны важнасьці пытаньняў яўка ўсіх членаў і рэвізійнай камісіі абавязкова. Запрашаецца актыў і добрахвотныя інструктары. Фракцыя ў 6 гадз. вечара.

Адказны сакратар гарком'у МОПР'у **ПІН.**

15-га ЛЮТАГА КАНЧАЕЦЦА КАМПАНІЯ ЗІМОВАЙ ДАПАМОГІ.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР паведамляе, што

кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям

канчаецца 15-га лютага 1931 году

ЦК МОПР'у БССР прапануе ўсім ячэйкам зараз-жа перадаць сабраныя сродкі на пошту для пераводу ў ЦК.

Гаркомам і райкомам МОПР'у праверыць, якія ячэйкі яшчэ не ўключыліся ў кампанію зімовай дапамогі, прыняць меры да разгортваньня гэтай кампаніі ва ўсіх ячэйках.

Тыя ячэйкі, ад якіх да 1-га сакавіка г. г. не паступяць сабраныя сродкі па КЗД, будуць лічыцца, як няпрымаўшыя ўдзелу ў КЗД.

Адначасова ЦК МОПР'у зварачаецца да ўсіх ячэек аб разгортваньні работы па ліквідацыі запазычанасьці па членскіх узносах за 1930 г. і спагнаньні членскіх узносаў за 1-ы квартал 1931 г.

ЦК МОПР'у БССР.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б склікае 10-га лютага, у 6 гадз. вечара ў памяшканьні Менгаркому (вуліца Пасьдженьняў, 3-ці паверх)

НАРАДУ

З ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Аб перабудове агітмасавай працы на прадпрыемствах.
2. Аб працы дэлегацкіх сходаў.
3. Правядзеньне 13-й гадавіны Чырвонай арміі.
4. Аб правядзеньні 8-га сакавіка.

На нараду павінны зьявіцца: прапаўнікі агіт-масавых сэктараў ячэек, кіраўнікі дэлегацкіх сходаў, культ-сэктары фабзаўкомаў—партыйцы, загадчыкі клюбаў і культ-прапаўнікі ЖАКТаў—парт'ійцы.

Сакратарам парткалектываў і ячэек КП(б)Б прапануецца забясьпечыць поўную яўку паказаных таварышоў.

З 1-га лютага г. г. пачала працаваць камісія

па ЧЫСТЦЫ

апарату кіраўніцтва ашчадкас БССР і ашчадкас г. Менску.

Матар'ял адносна працы пасобных супрацоўнікаў просьба падаваць у камісію па чыстцы (Савецкая, 59, пам. 6. Дзяржбанку, 2-гі паверх) ад 12 да 3 і ад 6 да 8 гадз. веч.

Старшыня камісіі па чыстцы **Штэйнгард.**

Камісія, выбраная гаркомам КП(б)Б 8-га лютага 1931 г. прыступае да дэтальнага

агляду працы газэтнага бюро

і дэтальнага высьвятленьня недахопаў

па распаўсюджэньні газэт, часопісяй

сярод падпісчыкаў. Усім упаўнаважаным прадпрыемстваў і ўстаноў па выпісцы газэт, а таксама падпісчыкам аб усіх недахопах з выпіскай газэт даваць матар'ялы камісіі.

Дактары патрэбны Менгарстрахкасе для працы ў доме адпачынку (Ждановічы) і ў якасьці даверанага доктара Страхкасы.

Аплата па згодзе.

Зварачацца да старшыні Страхкасы з 2 да 4 гадз.

Страхкаса

ПРЫЁМ ЗАЯЎ

на 1-ы курс факульт. санітарна-гігіенічнага і пекава-прафіляктычнага Бел. Дзярж. Мэдычнага Інстытуту

АБВЯШЧАЕЦЦА з 5 па 25 ЛЮТАГА

Экзамэны з 25 лютага па 3 сакавіка.

Дырэктар Мэдінстытуту.

Кіно-тэатр **КУЛЬТУРА** **СКОРА!**
Новы фільм вытворчасьці САЮЗКІНО (трэст Белдзяржкіно)
САПРАЎДНАЕ ЖЫЦЬЦЁ
Рэжысэры: А. ГАЎРОНСКІ і О. УЛІЦКАЯ
Апаратары: Д. ШЛЮГЛЕЙТ і Н. СОКАЛАЎ

Даводзіцца да ведама студэнтаў

Усесаюзнага Завочнага Інстытуту фінансава-эканамічных і рахункавых навук НКФ СССР і ДРУ,

што у гор. Менску

адкрыты і працуе філіял інстытуту і кансультацыйнае бюро для абслугоўваньня завочнікаў інстытуту, тэхнікуму і слухачоў ЦЗФК.

Кансультацыйнае бюро працуе з 5 да 7 гадз. 10, 20 і 30-га кожнага месяца ў Менску, Савецкая, 45, пакой 14.

Для устанаўленьня сувязі з студэнтамі-завочнікамі Інстытуту і тэхнікуму, у мэтах арганізацыі **дапамогі** (арганізацыя жывой і пісьмовай кансультацыі па прахадзімых дысцыплінах, скліканьне канф'ранцый, а таксама стварэньне адпаведных сэкцый) **арганізуецца** усім студэнтам інстытуту і тэхнікуму, пражываючым **на тэрыторыі Беларусі,** зарэгістравацца ў беларускім філіяле „ВЗИНО", шляхам дасылкі аб сабе наступных вестак:

1. Прозьвішча, імя і па бацьку; 2. Нацыянальнасьць; 3. Год нараджэньня; 4. Студэнт (інстытуту ці тэхнікуму) № пасьведчаньня; 5. На якім факультэце, аддзяленьні і цыкле; 6. Прафэсія (месца працы і пасада); 7. Сацыяльнае паходжаньне; 8. Партыйнасьць; 9. Адукацыя; 10. Поўны адрас.

УВАГА: Слухачы ЦЗФК, якія не перайшлі ў інстытут і тэхнікум, павінны таксама даць аб сабе гэтыя весткі з паказаньнем у п. п. 4 і 5 адпаведных даных.

Весткі неабходна прысылаць не пазьней 1 сакавіка па адрасе: *Менск, Савецкая, 45, будынак НКФ БССР, пакой 14, Беларускаму філіялу «ВЗИНО».*

УВАГА: Па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з інстытутам і тэхнікумам зварачацца ў філіял „ВЗИНО" па вышэй паказаным адрасе.

Загадчык сэктару кадраў НКФ БССР **Спарыхін.**

Загадчык Беларускім філіялам «ВЗИНО» **Івашчанка.**

15 сакавіка пры курсавой базе Белкаапсаюзу

ў Гомелі адкрываюцца 4-хмесячныя

КУРСЫ КІНО-МЭХАНІКАЎ

перасоўшчыкаў на 80 асоб і кулінараў на 80 асоб.

Прыём праводзіцца выключна па камандыроўках райспажыўтаварыстваў.

Правілы прыёму накіраваны ўсім РСТ.

Гом. Курсавая База БКС.

ЛЕПЕЛЬСКАМУ ПАЛІТРЭСТУ
ПАТРЭБНЫ
тэхнік-будаўнік і электрамацёр
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
З прапановамі зварачацца па адрасе: Лепель, ПРАМКАМУНТРЭСТ.

Тэрмінова прадаецца ШВЭЙНАЯ МАШЫНА
Замкавая, 30, кв. 2
ЯРМАЛКОВІЧ.

БЕЛТОРФУ
(Менск. Рэвалюцыйная № 3)
патрэбны
старшый бухгальтары і рахункаводы.

Партрэт
мастацкі павялічаны з любой фат. карт. разьмер на паспарту 32-40 см. 10 р. 75 к. з упак. і пер.
Адрас: „МОСКВА 2, почт. ящик 146, худож. маст. ГАГ".

У выпадку неакуратнага атрыманьня газэты
ЗВАНЕЦЕ
па тэлеф. № 15-42

Кошт публікацыі 1 р. аб згубе і дакументу

МЕНГАРКОМ КП(б)Б

склікае

11-II—31 г. у 12 гадз. дня у памяшканьні ГАРКОМУ КП(б)Б (3-ці паверх, вул. Энгельса, 28)

НАРАДУ

сакратароў вясковых ячэек прыгараднага раёну

з наступным парадкам дня:

1. Аб росьце партыі.
2. Аб рабоце з беднатой.
3. Мэтады і формы арганізацыі масавай работы па калектывізацыі.
4. Аб структуры парт'ячэек у вёсцы.
5. Аб мабілізацыі сродкаў.
6. Даклады в месц.

Яўка на нараду абавязкова і без спазьненьняў.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

ЗГОДНА РАСПАРАДЖЭНЬНЯ ЦЭНТРАСАЮЗУ і БЕЛКААПСАЮЗУ,

з 10 лютага 1931 г.

арганізавана Аршанскае ТПО,

якое будзе абслугоўваць

АРШАНСКІ ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ і ЛІНІІ:

ВОРША-ЛЕ